Новы Час | 25 кастрычніка 2019 | № 40 (651) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | №10

Літаратурная Беларусь

Выпуск №10 (158)
(кастрычнік)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by

Змест

«Ён не самотны...»

Данута БІЧЭЛЬ пра Алеся ЧОБАТА


— Данута Янаўна, Вы напісалі прадмову да зборніка вершаў Алеся Чобата «Год» (1992), дзе адзначылі, што ў вершах паэта — «імпульс неспакойнага часу, няўтульнага жыцця непадкупнага пакалення...». Чым адметны гэты зборнік?

— Вы самі адказалі на сваё пытанне. Чобату трэба было памяняць прафесію. Дакладней, пасля першага мітынгу Народнага Фронта, на якім Чобат быў арганізатарам, яму давялося пакінуць працу на прадпрыемстве ВА «Азот». Ён стаў прафесійным рэвалюцыянерам, каардынатарам выбарчай кампаніі Рэгіянальнага блока «Саветы-1990» на выбарах у Вярхоўны Савет XII склікання. Заняўся літаратурай, напісаў кнігу «Год». Гэта кніга пачаткоўца, але большасць вершаў перайшлі ў наступныя перавыданні. Кніга пра той час, калі пачынаўся развал вялікай імперыі д'ябла. А я ў дзевяностыя пісала прадмову да многіх першых кніжак таленавітых паэтаў, якія звярталіся да мяне.

— У 1997 годзе выйшла кніга «Ты не самотны...», створаная Вамі і Алесем Чобатам. Як нарадзілася такое адметнае выданне пра Максіма Багдановіча?

— Музей Максіма Багдановіча ў 1994 атрымаў юрыдычны статус самастойнага, да Максіма ехалі людзі з усяго свету, навукоўцы і даследчыкі з Англіі і Амерыкі. Калі людзі прыходзяць у музей, трэба, каб яны выходзілі не з пустымі рукамі, бо ўсё, што там пачулі і ўбачылі, хутка забываецца. У супрацоўнікаў з'явіліся магчымасці самастойна заняцца навукова-асветніцкай і выдавецкай дзейнасцю. Мы выдалі некалькі паштовак, буклетаў, сціплых кніжак пра гродзенскі перыяд жыцця Максіма Багдановіча. У Алеся Чобата з'явілася падборка вершаў, ён прапанаваў выдаць сумесна. У мяне быў не творчы час, шмат працы было ў музеі. Таму я сабрала, што змагла. Алесь жа стварыў лепшую падборку вершаў пра Паэта.

— У кожнага з вас свой паэтычны голас. Сваю нізку вершаў Алесь Чобат назваў «Ліст у Ялту». Гэта своеасаблівая паэтычная біяграфія Паэта. Вершам Алеся Чобата характэрна эпічнасць, нягледзячы на эмацыянальнасць, экспрэсію. Хоць кніга выйшла 22 гады таму, чаму яна гучыць так актуальна, так сучасна, нібы напісаная нядаўна?



Фота www.aarp.org

— Таму што гэта вершы пра геніяльнага паэта, якога любіць чытач, мы дакрануліся да той любові, якую аддаем Максіму. На сустрэчах модадзь чытае на памяць вершы з гэтага зборнічка...

— У творах Алеся Чобата ажываюць Горадня, Скідаль, вобразы людзей Горадні з мінулага і сучаснага жыцця. Радзіма — душа...

— Так аўтар пачынае ствараць «Кароткую гісторыю Беларусі» ў постацях яе прадстаўнікоў. Гэта адзіная рэальная мэта Алеся Чобата, дзеля чаго ён пачаў пісаць — і прозу, і паэзію, і эсэістыку, і журналістыку. Добра сказаў Анатоль Брусевіч у прадмове да кнігі Чобата «Кароткая гісторыя Беларусі»: «Усе гістарычныя постаці — ад Вялікіх князёў літоўскіх і рускіх ды каралёў Рэчы Паспалітай да вядомых паэтаў, навукоўцаў ці грамадскіх дзеячаў, гістарычныя асобы, якія ажываюць у кнізе — усе, без выключэння, маюць воблік, голас, беларускую душу аўтара».

— Проза Алеся Чобата — гэта арыгінальныя гістарычныя эсэ, свой погляд на асобы мінулага часу і сучаснасць. Аўтар часта палемізуе з сучаснымі гісторыкамі, гаворыць востра, нібы правакуе на аспрэчванне, гаворыць не надта прыемную праўду пра нас, беларусаў, наш нацыянальны характар.

— Чобат уважліва перачытвае гісторыкаў, палемізуе там, дзе даследчыкі падстройваліся пад польскую або расейскую «праўду», бо да свае не змаглі дадумацца, а хто дадумаўся, той спалохаўся яе. Бо ў нашай гісторыі стагоддзі пустэчы, смерці. А так жа быць не павінна!

Творчы час Алеся Чобата займаў перыяд ад 1990 да 2013 года. Ён шмат пісаў публіцыстычных эсэ на гістарычныя тэмы, якія ў Савецкім Саюзе былі забароненыя. Алесь уклаў кнігу прозы «На дзікай прэрыі над Котрай, Гаўяй і Шчарай» (2014), куды ўвайшлі тыя гістарычныя эсэ, якія аўтар лічыў удалымі, а гэта «Вайна 1920 года. Хроніка», «Армія Краёва на Беларусі. Хроніка», «БССР: 1919—1991», іншыя. І нельга не адзначыць яго эстэтычна-філасофскі твор «Трансфармацыя беларускай нацыянальнай ідэі», які перадрукоўвалі ў дзевяностыя многія выданні.

— Да пяцідзесяцігоддзя Алеся Чобата выйшла кніга яго паэзіі «Калі хочаце мець у Айчыне свабоду...». Аўтар як у ранніх, так і ў пазнейшых творах паўстае няскораным барацьбітом за волю і незалежнасць, за чалавечае ў чалавеку...

— Гэтую кніжку ўклаў і выдаў Язэп Янушкевіч. Аўтару тады было не да кніжак, ён катастрафічна губляў зрок... У такіх кніжках, дзе няма вершаў ні пра што, вельмі важна ўкласці творы тэматычна, адносна падзеям і часу ў адпаведным парадку. Вершы не разбітыя на раздзелы. Але добра, што Язэп іх сабраў, таму што гэта поўны збор вершаў Чобата, напісаных на той час.

— Гісторыя Беларусі — праз падзеі і лёсы людзей — у паэтычным асэнсаванні Алеся Чобата вельмі эмацыянальныя, публіцыстычна завостраныя, экспрэсіўныя. Што нараджае такую паэзію?

— Чобат у маладосці гуляў у шахматы, быў «другой шашкай» у рэспубліцы. І ён па прафесіі інжынер-канструктар, кіраваў на заводзе канструктарскім бюро. Таму ён дакладны ў паэзіі, скупы на словы, строгі, просты, зразумелы. Эмацыйнасць — прыглушаная, заглыбленая, прыходзіла ў працэсе вучобы і ўдасканальвання паэтычнай творчасці.

— Вельмі часта ў творах А. Чобата згадваецца 1863 год, падзеі і асобы таго часу. Чым гэта абумоўлена?

— Паўстанне 1863 года — гэта такая падзея, у якой Беларусь паўстае як Краіна, за якую людзі свядома ішлі на смерць. У кнізе, якую ўклаў Язэп Янушкевіч, сабраныя і пастаўленыя побач усе вершы пра паўстанне.

— Рэзкі, непрыкрыты метафарамі пратэст супраць няволі, слугавання чужому, супраць згодніцкага маўчання, «абы ціха было», — характэрны для паэзіі Алеся Чобата. Як мянялася яго слова з часам?

— «Палітыкі — гэта людзі, якія павінны прадбачыць будучыню», — Чэрчыль.

Чобат прыйшоў у грамадскае жыццё Горадні як палітык. Пісьменнікам ён стаў услед за палітыкам. Яго погляды і яго слова не мяняліся. Толькі дасканаліліся, узмацняліся. Чобат прыйшоў адначасна ў літаратуру і ў адраджэнскі рух са сваімі думкамі, са сваёй праўдай. І ён амаль не памыляўся. Вершы пісаць ён хутка навучыўся. У «Народным фронце» не ўмелі афармляць тэксты пратаколаў, заяваў, іншых дакументаў. Мяне здзівіў Чобат, калі трэба было напісаць «Звароты на плот» да выбарцаў: ён гэта зрабіў так, нібы ўсё жыццё іх пісаў. Так пачалося наша супрацоўніцтва.

— Прыгадайце, калі ласка, як працавалася Вам разам з Алесем Чобатам над перакладам паэзіі Караля Вайтылы? Як атрымалася кніга «Караль Вайтыла. Паэзія. Выбранае. Ян Павел II. Рымскі трыпціх» (2003)?

— Я з перакладамі святога Караля Вайтылы не спраўлялася. Усе цяжкія месцы Чобат браў на сябе, тыя вершы, якія я перакладала на свой выбар, Чобат мне таксама дапамагаў. Адчуванне мовы, веданне тэалагічных тэрмінаў, веданне Бібліі і Евангелля — у Чобата гэта ўсё ёсць, і шмат чаго ён разумее інтуітыўна.

— У 2016 годзе выйшла кніга Алеся Чобата «Планета». Як яна стваралася, як яе напісаў сляпы паэт?

— Чобат цяпер не піша вершаў, за невялікім выключэннем. Каб пісаць вершы, патрэбна жывое святло, таго, што ўнутры чалавека, мала. Але Чобат памятае ўсе свае творы — і вершы, і празаічныя апавяданні, і гістарычныя эсэ — дакладна, слова ў слова. У кнізе «Планета» ёсць нерыфмаваныя версэты, іх ён мне дыктаваў, а я запісвала. Я часта тады ездзіла да яго ў Скідаль. Скажам, твор «Былі такія, хто нараджаліся...» мы запісвалі ў два прыезды. Але ён дыктаваў гэта з памяці дакладна, не збіваўся. Пасля яшчэ і апраўдваўся: «У мяне гэта пайшло так гладка, бо я шмат разоў гэта перадумваў, перакручваў у сваёй памяці». Гэта і ёсць «Кароткая гісторыя Беларусі», дакладней, яе згустак, голая праўда, квінтэсэнцыя. Ён пісаў кароткую гісторыю мноства разоў. Спыняўся там, дзе на нашай зямлі перарывалася жыццё, бо нас вынішчалі дашчэнту. Так цяпер знішчаюць украінцаў. А мы глядзім і нібы не бачым... Калі ўся кніжка «Планета» была ўкладзена, прадыктаваныя празаічныя версэты, я прапанавала яму напісаць яшчэ нейкі твор, больш светлы, ці што, бо палохаць чытачоў сваімі прагнозамі не варта. Ён згадзіўся, і пра кароткі час прадыктаваў «Хатынь. Замест эпілога».

— Як жывецца «скідзельскаму самотніку» сёння?

— Чобат мае коцікаў, якіх ён успрымае як сям'ю, таму ён не самотны гэтую цемру пераносіць. Трэба ўмець слухаць сусвет і думаць, і любіць тых, каго табе Бог даў, на адлегласці.

Чобат жыве ў хаце, у якой нарадзіўся і рос, дзе набіваў гузакі да таго, як навучыўся хадзіць. Там нічога не змянілася. Тое, што хата не дагледжана, гэта на яго настрой не ўплывае, бо ён не бачыць. Бог праслаў Чобату апякунку, яго равесніцу Тацццяну Савянкову, дырэктарку Музея Элізы Ажэшкі ў Мількаўшчыне. А грашовыя пераводы шаноўнай лаўрэаткі Нобеля Святланы Алексіевіч даюць зразумець скідзельцам, што ў іхнім горадзе жыве чалавек, паважаны ў Беларусі, якога варта шанаваць.


Гутарыла Марыя Новік

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 10 (158) | 25 кастрычніка 2019 | № 40 (651) Новы Час

Самота, атлусценне і сяброўства…

Пра што пішуць лаўрэаты Еўрапейскай прэміі па літаратуры

10 гадоў таму Еўрапейскі Саюз заснаваў прэмію па літаратуры — каб папулярызаваць на міжнародным узроўні не надта вядомых, але таленавітых аўтараў з розных краін Еўропы. Намінантам прэміі можа стаць аўтар, які мае не менш за дзве, але не больш за чатыры выдадзеныя арыгінальныя кнігі.



Каардынуе прэмію адмысловы кансорцыум, які стварае нацыянальныя журы і арганізуе цырымонію ўзнагароджвання. Адметна, што конкурс можа ісці ажно цягам трох гадоў. Першы цыкл быў у 2009–2011 гадах, трэці скончыўся ў 2017-м. А ў 2019 годзе пачаўся новы цыкл, які завяршыцца ў 2021-м.

Кожны год каля 15-ці еўрапейскіх краін абіраюцца да ўдзелу ў конкурсе, пасля зацвярджаецца склад нацыянальных журы, бо ў кожнай краіне яно сваё. Ну а чальцы журы ўжо вызначаюць пераможцу.

У конкурсе маюць права ўдзельнічаць не толькі краіны-сябры ЕС, але і іншыя краіны Еўропы, якія з'яўляюцца ўдзельнікамі праграмы «Крэатыўная Еўропа», — агулам 41 краіна.

Лаўрэаты атрымліваюць грашовую прэмію ў памеры 5000 еўра і падтрымку ў выглядзе перакладаў сваёй кнігі, а таксама яе прамоцыю на міжнародным узроўні. Сёлета ў конкурсе перамаглі творцы з наступных краін: Аўстрыя, Венгрыя, Вялікабрытанія, Грузія, Грэцыя, Ірландыя, Італія, Літва, Польшча, Румынія, Славакія, Украіна, Фінляндыя і Францыя.

Пазнаёмімся з нацыянальнымі пераможцамі Еўрапейскай прэміі ды іх творчасцю.

Аўстрыя. Гэтую краіну прадстаўляе **Лаўра Фройдэнтхалер.**

Лаўра нарадзілася ў 1984 годзе ў Зальцбургу, вывучала нямецкую мову і літаратуразнаўства, філасофію, займалася гендарнымі даследаваннямі. Яе першая кніга выйшла ў 2014 годзе, а праз чатыры гады раман «Каралева маўчыць» атрымаў добрыя водгукі ад крытыкаў і — літаратурную ўзнагароду. Раман «пагружае» чытача ў ізаляваны космас вёскі і складаецца з фрагментаў успамінаў старой жанчыны. Гісторыя яе жыцця трагічная, аднак сама гераіня не ўспрымае яго так, яна, хутчэй, носіць гэты цяжар з гонарам, як «каралева». Другі раман пісьменніцы «Гісторыя прывідаў» пабачыў свет у 2019 годзе, і менавіта за гэтую кнігу Лаўра атрымала Еўрапейскую прэмію па літаратуры. Твор пра пустэчу, якая раптоўна ўтвараецца ў жыцці маладой жанчыны. Удзень яна блукае па вуліцах, уначы запісвае свае назіранні ў сшытак. Усё, што раней мела значэнне ў яе жыцці, паступова сыходзіць у цень…

Ад Венгрыі лаўрэатам стала **Рэка Ман-Варэдзі** (Réka Mán-Várhegyi).

Рэка нарадзілася ў 1979 годзе ў Румыніі, а ў 1990-м пераехала ў Венгрыю, дзе цяпер і жыве. Вывучала эстэтыку і сацыялогію, а таксама этнічныя меншасці. Пасля працавала рэдактарам дзіцячых кніг у выдавецтве. Яе першы зборнік кароткіх апавяданняў з'явіўся ў 2014 годзе і быў прызнаны вельмі ўдалым дэбютам. Рэка піша кнігі для дзяцей і падлеткаў, за якія атрымала ўжо некалькі літаратурных прэмій у 2013 і 2018 гадах. З чорным гумарам і яркімі дэталямі яна апісвае не ўсім бачныя будні венгерскай сям'і. Атлусценне, юнацкія комплексы, прабуджэнне сэксуальнасці — усё гэта можна знайсці ў творах аўтаркі.

Меліса Харысан (Melissa Harrison) стала лаўрэаткай ад Вялікабрытаніі.

Аўтарка раманаў «Гліна», «У часы глогу», «Усё сярод ячменю» і навукова-папулярнай кнігі (нон-фікшн) «Дождж: чатыры прагулкі ў англійскае надвор'е». Усе творы намінаваліся на літаратурныя прэміі. Меліса супрацоўнічае як калумністка з такімі выданнямі, як «The Times», «The Financial Times», «The Guardian» ды іншымі. Яе творчасць неразрыўна спалучана з прыродаю. Апошні раман, за які Меліса і была вылучаная на прэмію, апавядае пра восень 1933 года ва ўсходняй Брытаніі — гэта, на думку маці галоўнага героя, была самая прыгожая восень на яе памяці, хаця Вялікая вайна ўсё ж «кідае цень» на палі і вёскі вакол іх любімай фермы. З горада прыязджае даследчыца фальклору і этнаграфіі, каб запісаць вясковыя традыцыі, якія неўзабаве знікнуць. Галоўны герой і мясцовыя жыхары паступова захапляюцца наведніцай. Але з часам збору ўраджаю пачынае адчувацца эканамічны ціск на вяскоўцаў, і галоўны герой вучыцца давяраць сваім інстынктам і шукае спосабы ўратавацца ад катастроф…

Бека Адамашвілі (Beqa Adamashvili) стаў лаўрэатам ад Грузіі.

Вядомы грузінскі блогер, дырэктар крэатыўнага агенцтва вывучаў журналістыку і сацыялогію ва ўніверсітэце. Яго літаратурны дэбют адбыўся ў 2009 годзе. Бека апублікаваў у інтэрнэце свае кароткія апавяданні і адразу ж набыў папулярнасць сярод чытачоў. У 2014-м яго кніга «Бэстсэлер» стала сапраўдным бэстсэлерам у Грузіі. Добрае пачуццё гумару і глыбокія веды ў галіне сусветнай літаратуры, алюзіі на класічныя літаратурныя творы, а таксама выдатнае веданне прынцыпаў маркетынгу і рэкламы робяць яго апавяданні захапляльнымі і прыцягальнымі, што спрые росту папулярнасці.

Намінантам ад Грэцыі стаў **Нікас Хрысас** (Nikos Chryssos).

Аўтар нарадзіўся ў 1972 годзе ў Афінах і спачатку вучыўся на біёлага, а пасля вырашыў выбраць прафесію рэжысёра. Яму належыць букіністычная кнігарня ў Афінах. Нікас напісаў і выдаў дзве кнігі, сярод якіх раман «Новы дзень», за які ён і быў намінаваны на прэмію. Кніга апавядае пра прыгоды банды бяздомных, якія жывуць і паміраюць у порце «поўдня Еўропы» (Грэцыі). Раман пра жыццё і смерць, злачынствы і пакаранні. Па словах аўтара, менавіта «захапляльныя кароткія гісторыі, а таксама захапляльныя шматгранныя раманы складаюць ядро грэцкай літаратурнай традыцыі».

Ян Карсан (Jan Carson) была намінаваная ад Ірландыі.

Жыве ў Белфасце. Яе першы раман быў надрукаваны ў 2014 годзе і атрымаў добрыя водгукі. А ў 2015-м аўтарка штодзённа пісала кароткую гісторыйку на паштовай картцы і дасылала яе аднаму са сваіх сяброў. У кожнай такой гісторыйцы апісваўся нейкі момант з яе жыцця: падслуханая размова, пабачаная карціна, імгненная думка і г.д. У 2018 годзе зборнік гэтых звышмаленькіх апавяданняў атрымаў прыз ад Ірландскага саюза пісьменнікаў, а перад гэтым — у 2016-м — ад часопіса «Harper's Bazaar».

Лаўрэатам ад Італіі стаў **Джавані Дацыні** (Giovanni Dozzini).

Аўтар нарадзіўся ў Перуджы ў 1978 годзе, дзе жыве і цяпер. Працуе журналістам і перакладчыкам. З 2014-га — сябра арганізацыйнага камітэта «Encuentro», фестывалю, які прапагандуе іспанскую літаратуру ў Італіі. Займаецца музыкай і сам сябе называе «рок-зорка, у якой нічога не атрымалася». У сваіх творах Джавані ўздымае пытанне міграцыі. Апісвае-вывучае, што адбываецца з чалавекам, калі ён робіць першыя крокі на зямлі чужой краіны, яго страхі, жаданні, гнеў і настальгію, а яшчэ — надзею.

Нашу суседку Літву прадставіла **Дайна Апалскайтэ** (Daina Opolskaitė).

Аўтарка нарадзілася ў 1979 годзе ў Ваўкавішках, скончыла Віленскі педагагічны ўніверсітэт, дзе вывучала літоўскую філалогію. Цяпер працуе настаўніцай у школе ў родным мястэчку. У 2000 годзе атрымала прыз Літоўскага саюза пісьменнікаў за сваю дэбютную кнігу, а ў 2018-м — дзве літаратурныя прэміі за зборнік кароткіх апавяданняў. Дайна піша кнігі для дзяцей і падлеткаў. У 2017 годзе яе раман «І аднойчы, Рычы» стаў кнігай года. Раман апавядае пра сапраўднае сяброўства і ўздымае шмат важных пытанняў для падлеткаў, а самае галоўнае — імкнецца даць на іх адказы: «Як ты можаш адчуваць сябе шчаслівым, калі цябе зваць Баліс Белек? Што такое быць Белекам — гэта нішто. І нават калі дадаць рудыя валасы, добраахвотнікаў не знайшлося б. Іншы аднакласнік Рычы — прыгожы, разумны, смелы і спартыўны. Калі ён прыязджае ў школу на скутары, вочы ўсіх дзяўчат зззяюць, нібыта люстэркі».

Сучасную літаратуру яшчэ адной нашай суседкі, Польшчы, прадставіла **Марта Дзіда** (Marta Dzido).

Аўтарка нарадзілася ў 1981 годзе, скончыла школу кіно ў Лодзі і здымае дакументальныя стужкі. А яшчэ яна напісала тры раманы і навукова-папулярную кнігу «Жанчыны салідарнасці». Яе кар'ера як рэжысёра таксама паспяховая. Марта працавала галоўным аператарам на здымках дакументальнай стужкі «Underground Women's State» (2009 г.) і адным з рэжысёраў дакументальнага фільма «Downtown» (2010 г.), які атрымаў прыз «Hollywood Eagle Documentary Award» у 2011 годзе.

Намінант з Румыніі — **Тацццяна Цыбуляц** (Tatiana Ţîbuleac).

Тацццяна нарадзілася ў 1978 годзе ў Кішынёве, вучылася на факультэце журналістыкі Малдаўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Шырокая публіка ўпершыню даведалася пра яе ў 1995 годзе дзякуючы калонцы «Сапраўдныя гісторыі» ў штодзённай газеце «Flux». З 2008-га аўтарка жыве ў Парыжы. Яе дэбютам стаў зборнік кароткіх апавяданняў у 2014 годзе. У 2017-м яе першы раман «Лета, калі ў маці былі зялёныя вочы» атрымаў прэмію ад Саюза малдаўскіх пісьменнікаў, прыз літаратурнага часопіса «Observator Cultural» (Бухарэст) і прэмію «Observator Lyceum prize» на фестывалі ў Ясах. Кніга апавядае пра жанчыну, што памірае, і яе сына (якія праводзяць лета ў французскай вёсцы). Раман быў перакладзены на французскую і іспанскую мовы. Але на прэмію пісьменніца была намінаваная за раман «Шкляны сад», у якім яна таксама звяртаецца да тэмы маці, любімага і нелюбімага дзяцінства, піша пра трагічныя наступствы «бязвер'я». Лёс сіраты ў мультыкультурным Кішынёве, якому самотная і амбітная жанчына можа прапанаваць квітнеючую будучыню, а можа купіць у якасці працоўнай сілы і бязлітасна эксплуатаваць… Сталенне дзяўчыны паміж дзвюма мовамі і дзвюма культурамі (малдаўскай і румынскай) у гады, калі мяняюцца межы і палітычная сістэмы… Твор спалучае і жорсткасць назірання за трагічнымі падзеямі, і спачуванне героям.

Івана Дабракова (Ivana Dobrakovová) стала лаўрэаткай ад Славакіі.

Пісьменніца і перакладчыца жыве ў Турыне. Яе літаратурны дэбют — зборнік кароткіх апавяданняў — у 2009 годзе быў намінаваны на «Anasoft Litera prize» і атрымаў прэмію «Ján Johanides Award» у катэгорыі «Найлепшая проза ад маладога аўтара». А другі раман — «Bellevue» (2010 г.) — апісвае жыццё маладой славацкай жанчыны, у якой здарыўся нервовы зрыў пасля працы ўлетку ў міжнародным лагеры для людзей з інваліднасцю ў Марсэлі.

Сучасную літаратуру нашай суседкі Украіны прэзентуе **Гаська Шыян.**

Пісьменніца, перакладчыца, блогерка, фатографка. Нарадзілася ў 1980 годзе ў Львове. Вывучала класічную філалогію ў Львоўскім універсітэце. З'яўляецца сууладальніцай кнігарні ў Львове, змагаецца супраць карупцыйных схем пры закупках падручнікаў для школ. Адкрыла Школу маладога пісьменніка, а ў 2014 годзе надрукавала свой першы раман, большая частка якога была напісаная на мабільным тэлефоне, калі аўтарка ляжала ў бальніцы. Цяпер пісьменніца жыве ў Кіеве. Яе твор пра 27-гадовую паспяховую ўкраінку, жыццё якой рэзка змянілася, калі яе хлопец прыйшла позва ў войска. Вайна падштурхне гераіню да пераацэнкі ўласных каштоўнасцяў і прыняцця няпростых рашэнняў…

Фінляндыю прадстаўляе **Пія Лейна** (Piia Leino).

Пія нарадзілася ў 1977 годзе, жыве ў Хельсінкі, працавала журналісткай на тэлебачанні амаль 20 гадоў. Яе першы раман быў прысвечаны рэаліці-шоў і апавядаў аб праблемах, з якімі сутыкаюцца жанчыны. Як аўтарку яе цікавяць правілы, згодна з якімі функцыянуе грамадства, і як яно развіваецца. Папулярная культура, сацыяльныя медыя і палітыка — вось галоўныя тэмы яе твораў.

Ад Францыі Еўрапейскую літаратурную прэмію атрымала актрыса і пісьменніца **Сафі Доль** (Sophie Daull).

Яна нарадзілася ў 1965 годзе. Вывучала музыку ў Нацыянальнай кансерваторыі ў Страсбургу, што і падштурхнула яе стаць актрысай, а потым паспрабаваць сябе ў літаратуры і ў жанры інсталяцый з музыкай і рухамі. Яе першы твор «Camille, mon Evolée» (2015 г.) атрымаў прыз за найлепшы дэбют ад часопіса «Lire».

Алена Няпальская,
паводле euprizeliterature.eu

Алесь Разанаў: галасы з Літвы



Алесь Разанаў з Альмай Лапінскене

Чытаючы кнігу

Алесь Разанаў, адзін з самых адметных сучасных беларускіх паэтаў, сваім творчым почыркам, моваю, яе рытмікай, а таксама сваім светаадчуваннем прыкметна вылучаецца сярод сваіх калег. Гэты паэт-філосаф піша вершы, паэмы, версэты, пункціры, памысна ломячы звыклыя жанравыя каноны, творыць, што дагэтуль не мела наймення, — зномы, вершаказы, квантэмы.

Аднак нам важна, што ён не толькі самабытны творца, але і адмысловы перакладчык. Прыехаўшы са сваім сябрам у 1973 годзе на некалькі дзён у Вільню, неўзабаве вярнуўся зноў, ужо на паўгода — вывучаць мову, і з таго часу, асвойваючы абсягі перакладу і знаёмячыся са з'явамі літоўскай літаратуры, наведваўся ў Вільню не аднойчы.

Так, на беларускую мову ён пераклаў вершы А. Малдоніса, С. Гяды, М. Марцінайціса, Ю. Марцінкявічуса і другіх аўтараў, раман Ё. Авіжуса для выдавецтва, п'есу К. Саі для тэатра. Мабыць, маюць рацыю знаўцы, якія кажуць, што літоўская літаратура і праца над перакладамі спрычыніліся да фармавання мовы паэзіі і асаблівасцяў творчасці самога Алеся Разанава.

Калі паэт пачаў цікавіцца літоўскай літаратурай, яго знаёмая, выдатная знаўца беларускай літаратуры, даследчыца літаратурных сувязяў Альма Лапінскене ўзялася перакладаць яго творы на літоўскую. У 2008 годзе ў Вільні выйшла кніга паэзіі А. Разанава «Паляванне ў райскай даліне», а ў 2013-м — «Падарунак хроснай маці».

Аднак найбольш усіх нас Алесь Разанаў здзівіў, пачаўшы сам тварыць па-літоўску.

Пры зычлівым садзейнічанні Лапінскене аб'явіў свае пункціры ў нашых культурніцка-літаратурных выданнях «Metai», «Krantai», «Naujoji Romuva», а ў 2018 годзе выдавецтва «Homo Liber» выдала іх асобнаю кнігай — так у нашых кнігарнях з'явіліся «Літоўскія пункціры».

Чытаючы гэтую кнігу, немагчыма западозрыць, што пункціры напісаны не нашым суайчыннікам, не тутэйшым: так адмыслова А. Разанаў валодае літоўскай мовай, адчувае яе нюансы, яе асаблівасці, семантычныя пласты, зачароўвае гульнёю слоў.

Тут не ўблытаешся ў гушчар метафар, не натрапіш на пустапарожняе красамоўства, але знойдзеш тое, што не аднойчы бачыла і што на гэты раз само зірне на цябе.

У аддзяку Алесю Разанаву за яго ўвагу і любоў да літоўскай мовы, за яго пераклады літоўскай літаратуры на беларускую мову на з'ездзе пісьменнікаў Літвы ў 2018 годзе ўсе сябры Саюза аднагалосна прагаласавалі за тое, каб надаць яму званне ганаровага сябра Саюза пісьменнікаў Літвы: іх у нас трое. Мы ганарымся, маючы ў сваіх шэрагах такога таленавітага творцу і спадзяёмся, што ён зноў парадуе нас новай літоўскай кнігай.

Бірутэ Ёнушкайтэ, старшыня Саюза пісьменнікаў Літвы

Алесь Разанаў і літоўская мова

Алесь Разанаў — паэт творчай канцэпцыі. Яго перш за ўсё займаюць анталагічныя пытанні, таямніца быцця, загадкі жыцця і светабудовы, іхнія ўзаемасувязі і сувязі з людскімі лёсамі. І яшчэ з'ява, з якой ён сам мае справу, — мова. І не толькі родная. А ў ёй не паэтычныя, якімі б яны ні былі, фігуры, а само слова, у фанемах якога



гучыць семантычная глыбіня і ў радавішчах якога бачацца ці прадбачацца закадзіраваныя пласты рэчаіснасці. Паэт імкнецца распазнаць утоены змест слова, яго паходжанне, разгадаць яго код, бо, паводле яго выказвання, кірунак слова, як і зярняці, — знутры. Наогул, мова для паэта — крыніца спазнання свету, з'ява, вартая пільнай увагі. «Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны твор, і гэты твор — мова», — кажа ён у адным са зномаў.

Такое стаўленне да мовы, да яе як анталагічнай з'явы становіцца тым заўсёдным імпульсам, які амаль непазбежна ўводзіць у абсягі, дзе мова асвойваецца глыбока і ўсебакова, — у абсягі перакладу. Хачу засведчыць: А. Разанаў — выдатны перакладчык літоўскай літаратуры.

Пасля творчай камандзіроўкі ў Літву, што доўжылася з зімы 1973 па лета 1974 года, ён увайшоў у групу перакладчыкаў, што пачала рыхтаваць да друку двухтомную анталогію літоўскай савецкай паэзіі (выйшла ў 1977 годзе). Над анталогіяй рупіліся 48 перакладчыкаў, сярод іх А. Разанаў меў перавагу ў тым, што мог працаваць непасрэдна з арыгіналам.

Увосень 1982 года, сустрэўшыся ў Мінску, гутарыла з А. Разанавым пра анталогію, спецыфіку перакладчыцкай работы, яе складанасці і асаблівасці. Ён здзівіў мяне тым, што не толькі валодаў літоўскай мовай, а і адчуваў яе. На пытанне, што аказалася самым няпростым пры перакладзе літоўскай паэзіі, А. Разанаў назваў архаічнасць літоўскай мовы. З 86 літоўскіх паэтаў, прадстаўленых у анталогіі, А. Разанаў пераклаў творы 31 аўтара, з іх 16 сам, амаль трэць ад усіх змешчаных у анталогіі вершаў. Рэдактар анталогіі Васіль Вітка прызнаваўся, што А. Разанаў паспяхова, прафесійна перакладае і класіку, і найноўшых паэтаў. І гэты поспех невыпадковы. А. Разанаў — таленавіты творца. Уражвае яго ўспрымальнасць, паэтычнае чуццё, здольнасць паглыбіцца ў светаадчуванне і творчы почырк таго паэта, які перакладаецца, паразумецца з самою існасцю твораў і суадпаведна ўзнавіць іх на роднай мове.

А. Разанаў прымаў чынны ўдзел у перакладзе зборніка Альбінаса Жукаўскаса «Бяздомная любоў» (1974), кнігі паэзіі Юсцінаса Марцінкявічуса «Трава і камень» (1981), Альфансаса Малдоніса «Вадзяныя знакі» (1985). Пераклаў п'есу Казіса Саі «Дзявітабедаўцы», ягоную аповесць для дзяцей «Гэй, хавайцеся!», а праз некалькі гадоў раман Ёнаса Авіжуса «Час, калі пусцеюць сядзібы» (1989). Зноў вярнуўся да паэзіі і ў 1992 годзе выдаў невялічкі зборнік літоўскай паэзіі «Белы замак на гары», які склалі падборкі вершаў Марцэліюса Марцінайціса, Сігітаса Гяды і Эдуардаса Межэлайціса. Адно з апошніх выданняў — «Выбраная лірыка» Юсцінаса Марцінкявічуса (2019): доля ўкладу Алеся Разанава важкая.

Невядомая мова, мова іншага народа вабіць А. Разанава як нязведаная глыбіня.

Ад пачатку 2001 года, жывучы ў Нямеччыне, Аўстрыі, Швейцарыі, ён так далучыўся да нямецкай мовы, што, як сам прызнаецца, папросту гутарыў з нямецкімі словамі; вынікам такой гутаркі сталіся «Wortdichte» (2003) — самім паэтам напісаная па-нямецку кніга вершаказаў. Пасля гэтага з'явіліся «Der Zweig zeigt dem Baum wohin er wachsen soll» («Галіна паказвае дрэву, куды яно мае расці», 2006), «Der Mond denkt, die Sonne sinnt» («Месяц думае, сонца мысліць», 2011) і кніга нямецкіх пункціраў «Von nah und fern» («Зблізку і здалёк», 2016).

Па-літоўску А. Разанаў пачаў тварыць недзе гадоў пяць таму. На запытанне, што яго падштурхнула да гэтага, напісаў: «У маёй суадносіне з літоўскай мовай таіліся зместы, якія хацелі выявіцца і назвацца. Я пачаў ім у гэтым спрыяць — жывыя, выхапленыя з рэчаіснасці, назіранні і фонасемантыка літоўскай мовы пачалі знаходзіць узаемапаразуменне. У кожнай мовы свая рэчаіснасць, фонасемантыка літоўскай мовы адкрывала абсягі, якія не краналіся ні беларускай мовай, ні нямецкай, з якой я таксама меў справу, і я ўваходзіў у гэтыя абсягі з хваляваннем: яны мне былі нейкім чынам знаёмыя. Што яшчэ? А тое, што ім папярэднічала. Мае́ пераклады з літоўскай, вёсны паэзіі, перакладчыцкія семінары і даўняе, наша з табой, супрацоўніцтва. Ад цябе за колькі гадоў да таго, як яны пачалі ўзнікаць, у часе сумесных чытанняў у Літве я атрымліваў настойлівыя імпульсы: спрабуй... твары... пабудзь літоўскім творцам!.. Недзе, мабыць, у Бірштанасе, сказаў, што адчуў, — што ўваходжу ў размову з літоўскай мовай: літоўская мова пачала мне адкрываць свае зместы. Без гэтай узаемнасці літоўскія пункціры не змаглі б адбыцца».

Публікацыі напісаных па-літоўску пункціраў А. Разанава з'яўляліся ў часопісах, а затым выдавецтва «Homo liber» надрукавала «Літоўскія пункціры» асобнаю кнігай.

Кніга ўражвае прыгожай, багатай літоўскай мовай, паэтычным чуццём, здольнасцю ўбачыць, пачуць, адчуць нечаканыя суадносіны слоў. Літоўскае слова для А. Разанава — быццам скарб, знойдзены ў куфэрку. Пачутыя, выяўленыя паэтам сугуччы натуральна, нібы неўпрыкмет, адкрываюць глыбокія семантычныя сувязі слоў. Побач з сугуччамі, сэнсавымі звязкамі і алітэрацыямі ў кнізе нямала вобразных выразаў, арыгінальных метафараў: сцежку цыруе трава, дождж ідзе па рацэ, сонца тчэ палатно прыцемак і інш. Радуюся, што выдатны, блізкі да нас суседствам, беларускі паэт Алесь Разанаў стаўся і літоўскім творцам.

Альма Лапінскене, літаратуразнаўца, перакладчыца

Чароўнасць кароткага жанру

Асоба Алеся Разанава выключная ў літаратурных сувязях Літвы і Беларусі. Гэта цягам дзесяцігоддзяў ён даказаў перакладамі літоўскай паэзіі, драматургіі і прозы на беларускую мову, гэта яшчэ раз пацвердзіў створанымі на літоўскай мове «Літоўскімі пункцірамі». За ягонае культурнае амбасадарніцтва тры гады таму паэт атрымаў ганаровую ўзнагароду — «Зорку дыпламаты Літвы».

Выявіўшыся як творца самабытных аўтарскіх жанраў у беларускай паэзіі, А.Разанаў і ў літоўскай паэзіі стварыў самабытны «пункцірны» жанр — не раўнуючы, літоўскае хайку.

У «пункцірах» надзвычай важныя ўнутраныя сувязі слоў, алітэрацыі: *Jaunatis ragina?../Sraigė/Iškelia ragelius (Маладзік заахвочвае?.. Слімак выстаўляе рожкі).*

«Паэтычныя этымалогіі» ўражваюць натуральным тонкім чуццём і вобразнасцю.

З зычных, галосных і іхніх повязяў А. Разанаў творыць алхімію літоўскай фанетыкі:

Ar dar?/Ar gana? –/Dargana/Gano pievą (Ці яшчэ? Ці годзе? — Непагадзь пасвіць луг).

Толькі паэт «з боку», пэўна, так здольны пачуць літоўскую мову, яе шэпты і падшэпты: *Patenkintas vapa/puodas:/kvapu/bulvės užpildo butą (Задаволены, мармыча гаршчок: пахам бульбы напоўніў кватэру).*

Можна сцвярджаць, што ў літоўскіх «пункцірах» А. Разанаў гуляе з мовай, дэканструктуе яе вальней, чым у напісаных на роднай мове «пункцірных» аналагах, дзе дамінуе лагічнае разгортванне думкі.

Сустракаецца ў «пункцірах» і простанародная лексіка: *«žemė / kvošisi po žiemos» (зямля ачуньвае пасля зімы);* сустракаюцца і каларытныя рэдкія словы: «kaukaras» — узгорак, «viešmuo» — ручаіна, «lizduojasi» — віе гняздо, «viešniauja» — гасцюе.

Не пазбягае Разанаў і наватвораў: «lašti» (цэдзіцца па кроплях), «prabangauja» (раскашуе).

Другі від «пункціраў» — гэта каляровыя, пірасманеўскія малюнкі: *«išdidžiai / tešmenį neša karvė» (ганарыста вымя нясе карова)* , *«ežiukas/žiūri dygliais» (вожык дзівіцца іголкамі), «neša/moteris glėbyje/moliūgą» (нясе жанчына ў абярэмку гарбуз).*

Пейзажнасць «Літоўскіх пункціраў» універсальная і разам з тым паўночна прыгашаная.

Вось яно, Вялікае Княства Паэзіі Алеся Разанава: літоўска-беларускія краявіды з пеўнямі, жаўрукамі, буслямі. Паэтычны рух у гэтых вершах падкрэслена павольны, штодзённы, ён паступова ўводзіць нас у змену дня і ночы, у плынь пораў года.

Алесь Разанаў у «пункцірах» вельмі суладна гутарыць з прыродай, жывыя і нежывыя прадметы ў яго вершах узаемадзейнічаюць і размаўляюць: *Galbūt nubusi?.. –/Lietus/akmenį įkalbinėja (Можа, абудзішся?.. — Дождж угаворвае камень).*

У «Літоўскіх пункцірах» А. Разанаў плённа спалучае традыцыю і мадэрн, перадаючы адвечныя тэмы прыроды мінімалістычнымі формамі і нечаканымі слоўнымі спалучэннямі. Радкі, сфармуляваныя ім, захапляюць сваёй ашчаднасцю і змястоўнасцю:

Stiebiasi pienė,/stebisi:/jau debesy (Цягнецца дзьмухавец, дзівуецца: ужо ў небе?)

Можна смела сцвярджаць, што Алесь Разанаў, застаючыся ў абсягах традыцыйнай лірыкі, адгарнуў новую старонку кароткага жанру — спачатку ў беларускай, а тады і ў літоўскай паэзіі.

Эвалдас Ігнатавічус, паэт, дыпламат

Пераклала з літоўскай Галіна Лінкевіч

Яблыкі па́даюць



Барыс
ПЯТРОВІЧ



Фота pexels.com

Размова, пачутая ўчора

— Вы даўно былі ў Хойніках?

— Ды колькі тыдняў мінула ўжо…

— А я сёння вярнуўся адтуль… Ці ведаеце вы — там з'явіўся новы бізнэс.

— Не, не чуў. Цікава. Што?

— Збіраюць сонца ў бутэлькі, вязуць праз блізкую мяжу і прадаюць на Украіне.

— Не можа быць! На Украіну вязуць? Ды там і свайго такога дабра хапае. Вось каб у Расію, на поўнач, ды нашыя сонечныя яблычкі. Можа, і паверыў бы.

— Ну дык у тым і цымус: лёгка прадаць тое, чаго ў кагосьці няма, а паспрабуй…

— Не, — перабіваючы, — не веру, тут нешта не тое… Хахлы не такія, каб купіць тое, чаго ў іх саміх хапае — толькі пакуй у пляшкі ды збывай маскалям… Думаю, купляюць яны, калі і купляюць, дык каб перапрадаць яшчэ даражэй.

— Так і ёсць… Не паверыш — у Турцыю.

— У Турцыю?.. Ды там і свайго такога дабра нямерана… Вось там ужо сонца дык сонца!

— Ну не скажы, у нас сонца асаблівае. Такога нідзе больш няма. Гэта мы самі не заўважаем, а замежнікі… скупляюць пад корань… І п'юць.

— П'юць?

— Ну а як жа. Ім жа, мусульманам, гарэлку піць нельга. А сонца — можна.

— А-а-а… Дык яно хмельнае… Як самагон. А я і не здагадаўся…

— Не, самагон тут ні прычым. Як па мне, дык — абсалютна звычайнае. Але ў іхніх рэстаранах каштуе страшна дорага. Бо ў іх такога няма. І думаюць экспартаваць у іншыя краіны. Ужо і ў Хойнікі прыязджалі, каб наўпрост скупляць, а не праз украінцаў. Кажуць, хахлы ўдвая-ўтрая кошт падвышаюць. А яны гатовы нашым тыя грошы плаціць.

— Слухай, а на Еўропу не спрабавалі сонца пастаўляць? У пляшках. Там жа столькі туркаў жыве… У адной Германіі мільёны…

— Не ведаю.

— О, як бы іхнія кебабы пад нашае сонейка пайшлі…

— Во, бачыш? Ніхто пакуль не здагадаўся. Кажу ж — новы бізнэс… Твая ідэя. Едзь у Хойнікі, скупляй бутэлькі з сонцам ды вязі ў Германію… Азалацішся мігам.

— Давай разам. Няёмка мне — ты ж першы даведаўся…

— Не, не магу я. У мяне ўжо з Польшчай кантракт… Хоць бы іх забяспечыць паспець.

— Дык а што мы — саматужна, у валізках праз мяжу будзем цягаць… Зарэгіструем фірму, зафрактуем фуру…

— Ты што? Там столькі сонца не будзе, калі фурамі пачнуць вывозіць…

— Дык а чаму толькі з Хойнікаў? З усёй Беларусі можна. Што там асаблівага…

— У тым і справа, што толькі з Хойнікаў. Спрабавалі з Нароўлі, з Брагіна, з Мазыра — зусім не тое… Толькі з Хойнікаў. А найлепшае сонца ўвогуле ў Вялікім Боры — вёска такая непадалёку ад Хойнікаў.

— Ведаю. Бываў там. Дзіўная вёска. Здаецца, нічога асаблівага — звычайнае паляшуцкае — палескае — вялікае сяло, а разам з тым…

— Што разам з тым?

— Як гэта сказаць… Ёсць у тых мясцінах сіла, якая ідзе проста з зямлі і… з сонца.

— Вось-вось… і ты заўважыў.

— Ды не заўважаў, калі быў там. Проста цяпер згадаў і… адчуў. Згадаў і адчуў.

— А што ты там рабіў.

— Сябар мой адтуль. Быў у яго ў гасцях. Ды хто толькі не родам адтуль. Адных пісьменнікаў… А мастакі, музыкі, прафесары, выкладчыкі… Цьма з той вёсачкі… дзясяткі. Я тады яшчэ падумаў: нібыта глуханянь балотная — і на табе…

— Пэўна, і сапраўды ёсць у той зямлі — і ў таго сонца — сіла нейкая невядомая, моц… І хто вып'е пляшачку іхняга сонца — глядзіш, лепшым стане. Ваявацьяму не захочацца, адкіне зброю, асадку возьме і вершык напіша, пэндзаль — і карціну намалюе…

— Дык трэба па ўсім свеце бясплатна рассылаць тое сонца, а ты кажаш — бізнэс…

— Бясплатна браць ніхто не будзе. Свет цяпер такі. Падвох убачыць. Скажуць: бясплатны сыр толькі ў пастцы, у мышалоўцы…

— Сапраўды. Я й не падумаў. Але — гэты не горшы варыянт, калі на добрай справе можна яшчэ і зарабіць. Адкладваю ўсё і заўтра ж еду туды. Па сонца… Каб свет лепшым рабіць… Без вайны каб…

«Грэшнікі»

ізноў праязджаю паўз гэтую вёску, у якой не спыняўся ні разу, але ведаю пра яе шмат, пачынаючы з ейнай амаль княскай даўняй гісторыі; учора тэлефанавала мама і сказала, што хлопец, які нядаўна прыйшоў з турмы, колькі дзён таму засёк тут сякераю трох жанчын, дакладней бабуль-пенсіянерак, з адною з іх ён жыў, а дзве іншыя былі суседкамі і штовечар прыходзілі да іх «на тэлевізар», а папросту — выпіваць і гуляць у карты

што падштурхнула хлопца на такое страшнае забойства — невядома: гарэлка, сварка — так, але гэта відавочна спрошчанае тлумачэнне, бо яны выпівалі не раз і да таго, бывала, напіваліся так, што нават выйсці з хаты не маглі і ляжалі ў ёй упокат на падлозе

значыць, у той вечар выпілі мала, не хапіла, каб адключыцца

значыць, языкі яшчэ працавалі і чаплялі адно аднога, заводзілі, выводзілі з сябе і давялі да сякеры…

я не магу аднавіць карціну таго вечара — гэта справа следчых, — я не хачу рабіць гэта, я еду міма вёскі, паўз пустыя хаты, еду і думаю: я тут часта праязджаю, але чамусьці ніколі не бачыў людзей, я толькі ведаю, што яны ў ёй ёсць, вось жа і выпадак гэты з забойствамі пацвярджае: людзі тут жывуць — хвалююцца, кахаюць, забіваюць…

так, я ніколі не бачыў на адзінай вуліцы гэтай вёскі людзей, тым болей дзяцей, нават летам, калі яны павінны прыязджаць да сваіх дзядоў і бабулек на канікулы… вёска гэтая страшная сваёю пустатою і ўлетку: калі ўсё вакол буяе, квітнее, тут ціха і шэра — шэрае дрэва дамоў, шэрыя дошкі платоў, шэрыя старыя яблыні і грушы — амаль без лісця і зусім без пладоў, шэрая ад нечапанага, прыгнанага з палёў, пылу трава ўздоўж шэрае сцяжыны…

таму я ніколі тут і не спыняўся — пралятаў на хуткасці

ага, сцяжына ёсць… значыць, нехта ж па ёй ходзіць, нехта яе пратаптаў

ці мо цяпер больш дакладна будзе — хадзіў? бо хлопец той (так, хлопец, яму ўсяго дваццаць чатыры гады…) у турэмным ізалятары, а бабулек забітых якраз учора пахавалі

што гэта робіцца ў нашых вёсках — думаю я, гледзячы на шэрыя хаты, што робіцца? я пражыў у роднай вёсцы першыя дваццаць гадоў і не памятаю, каб нехта карыстаўся замком — хаты не зачыняліся, і не было выпадку, каб нехта ў кагосьці штосьці ўкраў

а ўжо забойства…

вёска нашая вялікая, на той час больш за паўтары тысячы жыхароў, але за тыя дваццаць гадоў у турму селі толькі некалькі чалавек

за што:

адзін сварыўся з жонкаю, зайшоў сусед, заступіўся за жанчыну, муж у гарачцы накінуўся на яго і прапароў віламі бок (якраз сена ў хлеў закідаў) — пяць гадоў турмы; другі на машыне збіў пешахода — цёмначы не заўважыў (пералом рукі і пары скабаў): два гады зняволення; хлопцы «пажартавалі» — бабулькі неслі вязанкі саломы,назбіранай на калгасным полі, а пэтэвушнікі ззаду падпалілі іх, бабулькі спачатку ішлі ды радаваліся: ношка лягчэе, а потым, калі прыпякло, ляманту нарабілі, пераляканіся страшэнна — хлопцам па два гады «хіміі»; яшчэ адзін пасля танцаў прычапіўся да маладой настаўніцы, прыцісну ў да плота, не пускаў у хату, тая ў міліцыю — тры гады за «спробу згвалтавання»… і г. д., і да т. п.

а тут, за адзін год столькі дзікіх, невытлумачальных здарэнняў: трое мужчынаў па трыццаць гадоў згвалтавалі бабулю сямідзесяцігадовую — усе жанатыя, маюць дзяцей, і што ім трэба было? згвалтавалі п'яныя, а назаўтра раніцай, працверазеўшы, адзін павесіўся ад сораму, а двое другіх цяпер у турме… дзяўчына, дваццаць гадоў (не адважваюся назваць жанчынай), двое дзяцей, забіла мужа — засеп з «каханкам», накінуўся, сцягнуў яго, пачаў валтузіць на парозе, а яна ззаду, сякерай, ляжала ля грубкі, засекла мужа… навошта? сама ў турму, дзеці — у інтэрнат

нешта зусім не нашае, не беларускае за ўсім гэтым… адкуль яно? спадчына імперыі, якая праявілася такім чынам? дык імперыі той даўно няма… чаму ж раптам столькі злосці ды нянавісці абудзілася ў нашых людзях і ўзбуяла? не сказаць, каб раней не пілі — пілі… і напіваліся, але за нажы-сякеры не хапаліся,

было — сварыліся, лаяліся крыўдна і балюча, сваякоў да сёмага калена згадвалі, было — біліся, нават каламі, усім, што пад руку патрапіць: за зямлю, за мяжу, за здраду, але ж не забівалі… параную віламі з нецейкі, дык не кінуўся ж дабіваць, а ратаваць пачаў…

гляджу на хаты шэрыя, праязджаючы паўз іх, і не знаходжу адказу на сваё пытанне… ідзе вайна без вайны… вайна з самімі сабою… навошта? чаму? за што? хто вінаваты? хто распачаў яе і хто скончыць?

няма мне адказу

ніколі раней не спыняўся я тут, у гэтай вёсцы, і не буду спыняцца

Туман

чужымі дарогамі хадзіў ты доўга

і так і не знайшоў свайго шляху

не напаткаў яго, не набрыў на яго, і не таму, што ішоў ты туманам шызым, як тваё жыццё не, не толькі туманам

было — свяціла сонейка ўдзень, а ноччу спрыяла поўня, і ноччу, бывала, ты бачыў далей, чым удзень

бачыў усё, бачыў шмат, толькі так і не згледзеў наперадзе ці поруч сваёй дарогі

так і прайшло жыццё ў бадзяннi па чужых шляхах

і толькі калі да твайго ложка падышла бабуля з касою, ты нясмела спытаўся ў яе: ці не памылілася яна — ці не йшла да іншага, а заспела яго на чужой дарозе?

адказу ты не пачуў

але зразумеў, паспеў зразумець, што ўсё ж… што напрыканцы…

…збіўся з чужое дарогі

Яблыкі падаюць

Вочы шырока расплюшчыліся — не ў здзіўленні, а ў жалобе…

Не, больш дакладна — у жаху. Што ў гэтым выпадку было адным і тым жа: здзіўленне, жалоба і жах — адначасова — зрабілі твар каменным, гіпсавым адбіткам, маскаю таго чалавека, які цяпер назіраў за мною. А я, падскочыўшы, завіс у паветры і не апускаўся на зямлю: застыў, як на фотаздымку. Мне было добра так — раскошна, — да таго ж, я злавіў яблыка ў палёце і, адкусіўшы, заплюшчыў вочы ад асалоды. Я не адчуваў, што вішу ў паветры, мне здавалася, што я стаю на зямлі. І толькі позірк незнаёмца, немы крык, застылы на ягоным твары, вырачаныя вочы і гіпсавая маска, якія я ўбачыў праз нейкі час, прымусілі мяне агледзецца. І тут я заўважыў, што вішу, лунаю ў паветры, што паміж маімі нагамі і зямлёю нічога няма — пустэча, якую хочацца памацаць, каб упэўніцца, што там і сапраўды пуста: бясколернае шкляное паветра, а не празрыстыя зэдлік. Я выпусціў надкушаны яблык — ён упаў, пакаціўся і спыніўся пад маімі нагамі. Калі я цяпер апушчуся ўніз, я расцісну яго, раструшчу, а мне так не хочацца гэта рабіць, я з такім задавальненнем лепш бы з'еў яго, калі б ён не ўпаў у бруд між маіх слядоў. Нічога, яблык можна і памыць пад кранам, пад струменем халодна-халоднай вады, якая аддае іржою ўсіх трубаў, праз якія дайшла да майго дома… Я заўважаю, што думаю лішняе, што проста цягну час, бо трэба апускацца на зямлю… А як? Я даўно апусціўся б, калі б мог. «Яблык упаў, — думаю я, — значыць, зямное прыцягненне ёсць, значыць, у тым свеце, ад якога я адштурхнуўся, усё нармальна… Так, там, менавіта — там, усё нармальна… Нар-маль-на…» — я запнуўся, бо ўбачыў зусім недалёка ад яблыка і яблыні… сябе, толькі не ў паветры, а на зямлі, на траве, у незвычайнай, няправільнай, нязручнай паставе. Я згадаў, хто той чалавек з застылай маскай твару. Я зразумеў нарэшце, чаму здзіўленне-жах-жалоба застылі на ягоным твары.

Я бачыў яго, гэтага чалавека, ён бачыў мяне, але не таго, які назіраў за ім з вышыні, з паветра, а таго, хто ляжаў на зямлі, у траве, у такой нязручнай, ненатуральнай, няёмкай паставе…

Яшчэ адзін яблык упаў з яблыні і пакаціўся да ног… Маіх? Ягоных?

…І тут я паляцеў…

Промні святла



Людміла СІМАНЁНАК

***

Нібы ў чатыры творачы рукі —
Мы з Богам, дабраслiўцы ды зладзеі —
Ўсё дадаем няроўныя радкі.
Тлусцее кніжка. Вокладка старэе.

Падсумаваўшы высілкі усе
Сутворчасці спрадвечна-небяспечнай,
Рыхтуецца выданне пакрысе
Пад крыжам стаць у шыхт бібліятэчны.

***

Ёсць душа —
як сцяна непахісна-глухая,
Што ў сябе ані промня святла
не пускае,
Скарбы ў ёй ці лайно —
аніяк не спазнаеш,
Покуль лавай эмоцый
сцяну не зламаеш.

Ёсць душа як люстэрка —
любуйся сабою,
Не шукай дачынення
з паверхняй чужою,
Каб на вострае шкло
ў парыванні ахвочым
Не скалечыць навечна
далоні і вочы.

Ёсць душа-дыямент —
не сапраўдны, дык штучны,
Дзе на кожнае грані
агеньчык выключны.
Тут ад кропкі пагляду,
прадбачлівы дружа,
Выпадае, пашчасціць табе
ці не дужа.

А бывае, знаходзіш душу,
як крыніцу,
Дзе струменьчык святла
да паверхні бруіцца,
Што натхнёна напоіць
і вусны, і сэрца,
Дасць у спёку астыць,
а у сцюжу сагрэецца.

Ды няшмат будзе чыстых
крыніц ля дарогі —
Любяць чэрці ў іх мыць
капыты або рогі…

***

Дарэмна хваля светлага натхнення
Змывае асцярогу з галавы,
Бо наш Парнас — у багне пад карэннем,
Забыты, непатрэбны, ледзь жывы.

Майго гнязда галінка не ўтрымае,
Тупым сярпом спадзевы абкашу.
Цень прышласці паціху накрывае
Зняверана-спакойную душу.

Без мары аб прытулку ці начлезе
Прашу забыцца кінутай адну,
Як зрэзаную кветку, што не лезе
Ў часовую бліскучую труну.

***

На доўгі век ці на хвілінку
У небе крэслячы сляды,
Яшчэ не ведае сняжынка,
З кім побач ляжа і куды.

Ці то пры полюсе ў сумёце
Заблішча зоркай снегавой,
Ці то ў няскончаным палёце
Жывой абернецца вадой.

На нос шчаслівага дзіцяці
Або на пакрыва труны…
На чалавека як ні ўпасці —
Не датрываеш да вясны.

***

Ты дарэмна мяне пытаеш
Пра вытокі, шляхі, прычыны.
За люстэркам жыве чужая,
Невядомая мне жанчына.

Па-за срэбна-празрыстай сценкай,
Дзе прынад і вабнотаў многа,
У яе расхінутых зрэнках
Гінуць промні святла жывога.

***

Хваля віхляе, кружляе, пятлюе,
Хуткі фінал свой прадбачліва чуе,

Плынню хавае далёкія згадкі,
Бляклых пялёсткаў палошча ападкі,

Гладзячы светла-зялёныя травы,
Плаўна кладзецца на бераг смуглявы.

След бесклапотна мінулае долі
Лёгка ў нябыт адплывае без болю.

***

Б'е струмень па начоўках —
звініць у вушах
І дрыготкаю рук аддаецца.
Дамавік адвячоркам
узлазіць на дах
І адтуль, нечапаны, смяецца.



Малюнак В. Нагорнай

Не баіцца старэнькай антэны крыжа
І цікуе ў выдатным настроі:
Бліскавіцы халодным мільганнем нажа
Цёмна-сіняе покрыва крояць.

Мае час, пазіраючы ўніз на краі,
Падлічыць у прамоклым сутонні,
Колькі кінутых рэчаў за ноч ручаі
На аздобу русалкам прыгоняць.

***

Водсвет поўні з-за хмары міргнуў угары
І, ў шуканні дачаснай магілы,
Павярнулі раку да вытокаў вятры,
З кожным подыхам трацячы сілу.

Затрымаць маладосць ды каханне яшчэ
На паўночы амаль удалося.
З першым промнем да мора рака пацячэ
З відарысам таго, што збылося.

***

У акіянскай русалкі як трэба:
Жэмчуг, каралі ды золата з неба,
А ў рачной не хапае пялёсткаў
Шчыльна ўкрыць чалавечыя косткі.

Гонячы зайздрасць да пышнай сяброўкі,
Ціха ўздымае кругляўыя броўкі,
Леташніх гуляў хавае правіны:
Цягне шкілет у бузу-багавінне.

Стомлена чэша карэньчыкам косы,
Сочыць апошнія промні з нябёсаў,
Цешыцца плоткамі ў дне і сабою:
Хтосьці ж апоўначы йдзе над вадою…

***

Як мітусіць стракаты карагод,
Сачу з-за ценю соннага пагурка,
Нібы чужая, бо таму сто год
Праз злое слова сталася Снягуркай.

Наблізіцца, жахнуцца, адступаць
Ад берагу, дзе стылы вір бруіцца.
Ёсць рэчы, пра якія лепш маўчаць —
Прынамсі, да пары, пакуль маўчыцца.

Стаміўшыся бяздзейнасцю сваёй,
Вакол пагурка тройчы крутануся
І па-над незамерзлаю вадой
У лёгкім парыванні нахілюся.

Не прычакаўшы новую зіму,
Снег паплыве халоднаю ракою;
І, ўсцешаная, гэты лёс прыму,
Як лепшае, што збудзецца са мною.

***

Мой Цмок жыве ў глыбокім акіяне,
Куды з вышыняў промень не дастане,
І п'е струмень падводнае ракі,
І песціць неабдымныя бакі,
І жывіцца мільёнам трылабітаў —
Сучаснікаў гісторыі забытай,
Калі я валадарыла зямлёю,
Паловай мора, шчасцем і табою.

***

Непрыкметна штораз падыходжу сюды
Сілкавацца намерам прынадным:
Дакрануцца балюча-халоднай вады
І ступіць у яе неаглядна.

Кінуць выклік лагодна-разважнаму дню
У чаканні нязнанай пацехі,
І смяротную раптам спазнаць глыбіню
І няўменне трымацца паверхні.

Пасміхайся сабе. Ты, вядома, прывык
Да мігцення жаночых настрояў.
Пачакай-пачакай, мой сівы Вадзянік.
Я вярнуся. Я буду тваёю.

***

Лістота, як падраны парашут,
Вісіць у небе, тоячы трывогу.
На дне ракі імя тваё пішу,
Каб зоркі не заўважылі нічога.

Шчупак драпежна зыркае здаля,
А хваля — у вірЫ травою круціць.
Нас не сурочаць неба і зямля,
Бо вецер дна не можа скаламуціць.

Русалка спачувальна падміргне,
Хоць, ведама, ёй справы дужа мала,
Ці хутка твань руку маю глыне,
Што неабачліва імя тваё пісала.

Вечны свет



Наталля БОНДАР-ГАЛАВАЧ

***

Вецер.
Дождж.
Слота.
Ішоў чалавек па вуліцы.
Наўздагон за ім старасць,
туга, адзінота…
А тут яшчэ вецер…
Дождж…
Слота…

У Венецыі з Бродскім

(парафраз на тэмы)

Мае шпацыры з Бродскім па каналах
Венецыі самотнай і туманнай
Так значаць шмат.
І значаць вельмі мала,
Бо сварыцца за нашы стрэчы мама.

Ёй замінае розніца ва ўзросце.
Ну што там нейкіх дваццаць год ці болей?
Затое падыходзім мы па росце
І па заўсёднаму жаданню волі.

Яго і «э-э…», і «а-а…», як гук лагуны,
Як рыскі на прыціхлых водных хвалях.
Гайдаецца на іх старая шхуна,
Друкуюцца адвечныя скрыжалі.

Мне Одэна чытае ён і Фроста
У «Фларыяне».
Дольчы мы не елі.
Плануем яшчэ сёння да пагосту
На улюбёны востраў Сан-Мікеле.

Праз гукі песні тужнай гандальера
І крыкі-стогны чаек, шоргат качак,
І дух самога Дантэ Аліг'еры,
Ізвон касцёльны — плачам, плачам, плачам…

Што ў свет сплываюць бясконцыя нябёсы
Такім невычарпальным пульхным цудам,
І мы радкамі — вершамі ці прозай,
Гукаць аднекуль іх аднойчы будзем.

І што заўсёды недзе тут пад горлам
Каляны ком. І ў вечным тым кружэнні
Сядкуе па пятах за намі гора,
І смерць бліжэй ужо, чым нараджэнне.

А мы ў пакутах цешым сябе казкай
Пра нейкага такога дабрадзея,
Жывем са спадзяваннямі на ласку,
На ласку, на жыццё і на надзею.

Нібыта вернуцца і вечны свет, і слава,
Удалы дзень, і будзе ўдосталь хлеба.
Нібы жыццё хіснецца крышку ўправа,
Як перад тым хіснулася — улева.


Венецыя не ведае марозу,
Ёй уласціва восеньская просінь.
Але я мерзну ў крушні на парозе,
І паліць, як заўжды, зашмат Іосіф.

Калі ты — Бог…

Мама ў дзяцінстве была сонцам.
З яе пачынаўся дзень.
Потым акенцам.
Яна адкрывала свет.
Потым ахоўнікам.
ВартаўнікОм, калі стала –
Злавала мяне.
Раздражняла.
Потым зусім яна быццам
патрэбна была, быццам не.
У час апошні яна стала Богам.
Сказаць бы…
Няма каму.
Але, быць можа, мама, калі ты — Бог,
Дык мяне чуеш?

Полацкая Акадэмія

У першай палове XIX стагоддзя ў Літве-Беларусі быў не толькі Віленскі ўніверсітэт, але і іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы. Адна з іх — Полацкая акадэмія, што мела ўсе правы ўніверсітэта. У Полацку чыталі лекцыі вядомыя ў Еўропе і свеце педагогі, дзеячы навукі і мастацтва. Нягледзячы на нядоўгі час існавання, гэтая навучальня выхавала нямала знакамітых вучоных, пісьменнікаў, мастакоў. Невыпадкова сучасны Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт лічыць сябе пераемнікам Акадэміі, а студэнты некаторых яго факультэтаў займаюцца ў былых акадэмічных карпусах.



Уладзімір АРЛОЎ

Калегіюм Таварыства Ісуса

Папярэднікам Акадэміі быў Полацкі калегіюм, які адчыніў дзверы ў 1581 годзе. Навучальню стварылі манахі Таварыства Ісуса (так афіцыйна называецца каталіцкі Ордэн езуітаў).

За савецкім часам пра езуітаў нельга было пісаць або казаць нічога добрага. Іх называлі цемрашаламі, прыпісвалі ім самыя розныя грахі ды злачынствы. Насамрэч Таварыства Ісуса зрабіла ў гісторыі шмат карыснага: адчыняла друкарні, аптэкі і шпіталі, паспяхова змагалася з эпідэміямі, займалася дабрачыннасцю. Але галоўная заслуга Ордэна езуітаў — стварэнне самых перадавых для таго часу навучальных устаноў. Славуты англійскі філосаф Фрэнсіс Бэкан зазначыў: «Бярыце прыклад з езуіцкіх школ, бо лепшых не існуе на свеце».

У Полацку, як і паўсюль, за навучанне ў езуіцкім калегіюме не бралі платы. Туды прымалі дзяцей шляхты і духавенства, месцічаў і сялянаў. Ад шкаляроў не патрабавалася абавязкова быць каталіком ад нараджэння або мяняць веру. У калегіюм ужо на пачатку ягонай дзейнасці аддалі сыноў нават праваслаўны полацкі епіскап Феафан і ваявода Мікалай Дарагастайскі, які належаў да пратэстантаў-кальвіністаў.

Парог калегіюма вучань пераступаў у дзесяць гадоў. Ён ужо мусіў умець чытаць і пісаць ды быць трохі знаёмым з лацінай, што лічылася у тагачаснай Еўропе моваю навукі. Першай прыступкай да вяршыняў ведаў была гімназія. Навучанне ў малодшых класах, пакуль хлопчыкі не зусім добра валодалі лацінскай мовай, тады вялося па-беларуску.

У гімназіі займаліся шэсць гадоў. За гэты час трэба было так дасканала авалодаць лацінскай і старажытнагрэцкай мовамі, каб вольна чытаць на іх творы старажытных гісторыкаў Лівія і Плутарха, лісты красамоўца Цыцэрона, вершы Авідзія і Катула, «Іліяду» Гамера. У калегіюме вывучаліся таксама арыфметыка і геаметрыя, фізіка і астраномія, гісторыя і геаграфія, логіка і музыка.

Выпускнікі гімназіі мелі магчымасць займацца ў родных сценах далей: тры гады вывучаць у калегіюме філасофію або чатыры гады — тэалогію (багаслоўе).

«Імператары» і «аслінaя лава»

Вучыцца было нялёгка, але надзвычай займальна. Паміж вучнямі і класамі бесперапынна ішло цікавае, творча наладжанае спаборніцтва. Класы дзяліліся, напрыклад, на «грэкаў» і «рымлянаў». Калі «грэк» не мог адказаць на цяжкое пытанне выкладчыка, падымаўся з месца роўны яму па здольнасцях «рымлянін», і так працягвалася, пакуль не гучаў правільны адказ.

Захапляла навучэнцаў і асабістае спаборніцтва. У ім пераможца мог заваяваць медаль, кнігу ці абразок або ўрэшце атрымаць ганаровае званне «імператара». А вось тыя, хто вылучаўся нядбайнасцю, выпраўляліся, прысаромлена панурыўшы галаву, на «аслінную лаву». Зацятых гультаёў звычайна вянчалі саламянымі каронамі, якія нельга было здымаць, пакуль не выправішся.

Разам са звычайнымі дысцыплінамі шкаляры спасцігалі правілы паводзін сярод людзей рознага стану — ад простага люду да арыстакратыі. Шмат увагі надавалася фізічнаму выхаванню: гульням на свежым паветры, плаванню, верхавой яздзе, фехтаванню.

Пры Полацкім калегіюме з 1585 года існаваў тэатр. Спектаклі звычайна прымяркоўвалі да Каляд, Вялікадня, да пачатку і заканчэння навучальнага года. Шкаляры выходзілі на сцэну ў п'есах на антычныя і біблійныя тэмы, на сюжэты з айчыннай гісторыі. Нярэдка пастаноўкі прысвечваліся падзеям з жыцця горада і калегіюма, і гледачы маглі пазнаць у акторах саміх сябе. Тэатральныя паказы ў тыя даўнія часы адбываліся пераважна на лацінскай мове, але часам героі гаварылі і па-беларуску. Спектаклі суправаджала музыка ў выкананні створанага ў калегіюме аркестра.



Габрыэль Грубэр — генерал Таварыства Ісуса

Сабор святога Стэфана

Архітэктурнай славутасцю Полацка стаў збудаваны езуітамі мураваны сабор святога Стэфана. Храм узнёс свае вежы на шэсцьдзясят метраў і запанаваў над горадам. Адну з вежаў упрыгожыў гадзіннік з меладычным боем, які адлічваў кожную чвэрць гадзіны.

Поруч з беларускімі майстрамі аздабленнем сабора займаліся італьянскія майстры. Вернікаў уражвалі велічныя мармуровыя калоны і цудоўныя абразы. Некалькі з іх намаляваў у Вероне выдатны мастак Сальватор Роза. У сценах храма гучала музыка магутнага аргана.

Да канца XVIII стагоддзя каля сабора святога Стэфана паднялося некалькі дзясяткаў мураваных будынкаў. Там месціліся друкарня, кнігарня, кузня, шпіталь, аптэка, фармацэўтычная лабараторыя і сушыльня для зёлак, пякарня, бровар і медаварня, разнастайныя майстэрні і стайні. Разам з навучальнымі карпусамі, дамамі для святароў, выкладчыкаў і студэнтаў, з музеем і карціннай галерэяй, з багатым батанічным садам усё гэта было сапраўдным горадам у горадзе, прыстасаваным для самастойнага жыцця.

Славутыя ва ўсёй Еўропе

Апрача Полацкага калегіюма на землях былога Вялікага Княства Літоўскага існавалі яшчэ болей за дваццаць такіх навучальняў: у Вільні, Горадні, Берасці, Менску, Магілёве, Слоніме, Слуцку, Смаленску, Воршы, Пінску, Нясвіжы, Дынабургу (Дзвінску), Бабруйску... Аднак менавіта Полацкі калегіюм, дзе навучалася блізу трохсот студэнтаў, лічыўся сярод іх найбольш значным. У сярэдзіне XVIII стагоддзя ён даваў адукацыю, якая мала адрознівалася ад універсітэцкай.

Сярод выкладчыкаў калегіюма былі асобы, знаныя ва ўсёй Еўропе. Тут чытаў лекцыі філосаф і паэт, «хрысціянскі Гарацый» Мацей Казімір Сарбеўскі. Ягоныя полацкія лекцыі леглі ў аснову славутых трактатаў «Пра дасканалую паэзію», «Пра камедыю і трагедыю», «Пра жарт і дасціпнасць». Якраз у Полацку Сарбеўскі напісаў кнігі «Багі паганскіх народаў» і «Паэтыка», якія таксама чакала еўрапейская слава.

Навуку красамоўства — рыторыку — выкладаў у Полацку Жыгімонт Лаўксмін. Пасля выдання ў Вялікім Княстве ягоная кніга «Практычнае красамоўства» выходзіла ў Вене, Мюнхене, Празе, Франкфурце ... «Мова — гэта адлюстраванне душы, — пісаў Лаўксмін. — Па мове і нас пазнаюць, і мы пазнаём кагосьці. Трапна сказана: «Той збан не купляюць, які не звініць»».

Полацкіх студэнтаў захапляў сваімі лекцыямі будучы рэктар Галоўнай школы Вялікага Княства, астраном і матэматык Марцін Пачобут-Адляніцкі. Тут працаваў прафесар парыжскага Сарбонскага ўніверсітэта, гісторык і знаўца моваў Дзід'е Рышардо ды шмат іншых знакамітасцяў.

Такія педагогі і вучоныя выхоўвалі годных вучняў. Полацкіх выкладчыкаў з удзячнасцю згадваў адзін з найлепшых беларускіх мастакоў першай паловы XIX стагоддзя Валянцін Ваньковіч. У яго спадчыне выдатныя партрэты Адама Міцкевіча, Напалеона Банапарта, Тамаша Зана. У горадзе над Дзвіной спасцігаў таямніцы мастацтва расейскі скульптар і жывапісец Фёдар Талстой. Каб даць дзецям добрыя веды, расейская арыстакратыя часта прывозіла іх у Полацак.

У Полацку вучыліся будучы гісторык і археолаг Канстанцін Тышкевіч, пісьменнік і гісторык Нікадым Мусніцкі, які напісаў некалькі п'ес для тэатра роднага калегіюма. У энцыклапедыі ўвайшлі імёны філосафа, прафесара Віленскай акадэміі Караля Карыцкага і ягонага калегі Францішка Папроцкага, што ўзначальваў у Вільні акадэмічную друкарню і быў рэдактарам «Літоўскага кур'ера» — першай у Вялікім Княстве газеты-тыднёвіка. Выпускнік калегіюма Ян Баршчэўскі стаў выдатным пісьменнікам.

Габрыэль Грубэр

Яскравы след у гісторыі Полацкага калегіюма і ўсёй Літвы-Беларусі пакінуў вучоны і адзін з кіраўнікоў Ордэна езуітаў славенец Габрыэль Грубэр. Ён атрымаў бліскучую адукацыю ва ўніверсітэтах Граца і Вены, дзе з аднолькавым поспехам вывучаў шматлікія навукі і мастацтвы: філасофію і тэалогію, матэматыку, фізіку і механіку, астраномію, жывапіс і архітэктуру. Грубэр атрымаў навуковую ступень доктара медыцыны і выдатна валодаў дзесяццю мовамі. Гэта быў адзін з самых адукаваных людзей у тагачаснай Еўропе. Здавалася, немагчыма было знайсці такую галіну чалавечай дзейнасці, у якой прырода не надзяліла б прафесара Грубэра талентам. Нават да Пецярбурга данеслася слава не толькі пра Грубэра-вучонага, але і Грубэра-выдатнага кулінара.

У Полацку айцец Габрыэль выкладаў механіку, эксперыментальную фізіку, архітэктуру і маляванне. Ён марыў ператварыць навучальню ў другі пасля Віленскага ўніверсітэт на землях былога Вялікага Княства і настойліва ішоў да гэтай мэты. Руплівасцю прафесара Грубэра і паводле ягонага праекта для калегіюма збудавалі новы трохпавярховы корпус. Там знаходзіліся тры фізіка-механічныя, астранамічны, мінералагічны, хімічны кабінеты і архітэктурная зала,

Яскравы след у гісторыі Полацкага калегіюма і ўсёй Літвы-Беларусі пакінуў вучоны і адзін з кіраўнікоў Ордэна езуітаў славенец Габрыэль Грубэр. Ён атрымаў бліскучую адукацыю ва ўніверсітэтах Граца і Вены

абсталяваныя на роўні ўніверсітэцкіх.

Студэнты вялі назіранні зорнага неба праз перадавы для таго часу тэлескоп даўжынёю два з паловаю метра. Для фізічных эксперыментаў прызначаліся тры электрычныя машыны і вялікі электрафор, з дапамогай якога атрымлівалі электрычнасць. Мінералагічны кабінет знаёміў з узорамі горных парод, каштоўных камянёў, металаў, акамянелымі парэшткамі жывёлаў, рыб і раслін. У архітэктурнай зале, дзе студэнты займаліся маляваннем, захоўваліся дзясяткі мадэляў і копій будынкаў, мастоў, калонаў розных эпох.

У адным з механічных кабінетаў непадрыхтаванаму наведніку магло здавацца, што ён трапіў у каралеўства дзівосаў. Па зале ездзіў у вазку жалезны старажытнарымскі бог кахання Купідон. У краме гандляваў купец-аўтамат з металу, побач граў на клавесіне механічны музыка. А зірнуўшы ў вакно з адмысловым люстэркам, можна было неспадзявана ўбачыць самога сябе на крыжы пад званіцаю базылянскага манастыра. Аўтарам большасці з гэтых механізмаў і вынаходак быў сам прафесар Грубер.

Дзякуючы Габрыэлю Грубэру і яголным аднадумцам пры канцы XVIII стагоддзя Полацкі калегіюм дасягнуў роўню сапраўднай вышэйшай навучальнай установы. Там вывучалі польскую, беларускую, расейскую, французскую, нямецкую, лацінскую і грэцкую мовы. Апрача ранейшых дысцыплін, у праграме былі тэарэтычная і практычная механіка, эксперыментальная фізіка, вышэйшая матэматыка, вайсковая і цывільная архітэктура, тэорыя жывапісу, псіхалогія, этыка.

Рубенс і механічная галава

Калегіюм ганарыўся карціннай галерэяй і музеем, якія таксама адчыніў Габрыэль Грубэр. Наведнікі захоплена спыняліся тут каля карцін Пітэра Паўля Рубенса «Смерць Архімеда» і «Пошукі Архімедавай магілы». Галерэя мела вельмі добрыя копіі з твораў знакамітых Рафаэля і Тыцыяна, багатую калекцыю партрэтаў герояў еўрапейскай гісторыі, карціны самога Грубэра. Ён жа размаляваў сцены музея прыгожымі фрэскамі.

Найкаштоўнейшай часткаю музейнай экспазіцыі была калекцыя старажытных манет, што займала сем вялікіх шкляных вітрын. Побач захоўваліся даўнейшыя рукапісы, цікавыя археалагічныя знаходкі, зброя розных плямёнаў і народаў, велізарная калекцыя ракавін.

Але галоўным дзівам калегіюма лічылася створаная полацкімі механікамі на чале з Грубэрам механічная галава. У адной з музейных залаў высока ў сцяне была ўштукаваная галава старога з сівымі валасамі. Галава рухалася, вочы старога глядзелі то лагодна, то з прыхаванай усмешкаю, то сувора і пагрозліва. Ды найперш галава здзіўляла, захапляла і палохала наведнікаў тым, што размаўляла. Манах-экскурсавод прапаноўваў на любой мове задаць галаве любое пытанне, і тая без роздуму гучна і з веданнем справы адказвала на той самай мове.

600 студэнтаў і 40 прафесараў

Мара Габрыэля Грубера пра новы ўніверсітэт здзейснілася, калі прафесара ўжо не было на свеце. У 1812 годзе расейскі імператар Аляксандр I пасля шматлікіх просьбаў ліцьвінскай арыстакратыі і шляхты падпісаў указ пра пераўтварэнне Полацкага калегіюма ў Акадэмію з усімі ўніверсітэцкімі правамі. Старажытны горад над Дзвіной адзначыў гэтую падзею ўрачыстымі набажэнствамі, феерверкам і баламі. Прывітальныя прамовы і вершы з нагоды свята гучалі на сямі мовах, у тым ліку і на беларускай.

Студэнтаў чакалі тры факультэты: тэалагічны; моваў і літаратур; вольных мастацтваў і філасофіі. У дадатак да ранейшай праграмы калегіюма на філалагічным факультэце вывучаліся старажытнагабрэйская, італьянская і арабская мовы. Да шматлікіх колішніх дысцыплін дадаліся права, статыстыка, палітычная эканомія, мінералогія, трыганаметрыя, заалогія, батаніка. Праўда, навучанне вялося пераважна на польскай мове.

У акадэмічным выдавецтве друкаваліся падручнікі, слоўнікі, навуковыя трактаты, календары і мастацкія творы. Выходзіў навуковы часопіс «Полацкі месячнік». Сорак тысяч кніг налічвала бібліятэка Акадэміі. Сярод іншых каштоўнасцяў тут захоўваліся тры рукапісныя Евангеллі XII–XIV стагоддзяў і вялікая калекцыя вялікакняскіх грамат.


Вышэйшую адукацыю ў Полацкай акадэміі набывалі шэсцьсот студэнтаў. Як і ў Віленскім універсітэце, гэта былі пераважна беларусы-ліцьвіны. З нашых земляў паходзіла і большыня прафесараў.

У аўдыторыях Акадэміі пачалі шлях у навуку гісторык Канстанцін Тышкевіч, астраном і філасоф Якуб Накцыяновіч, пісьменнік Юзаф Масальскі. Тут працягваў навучанне вядомы выпускнік Полацкага калегіюма будучы майстар прыгожага пісьменства, аўтар неўміручай кнігі «Шляхціч Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» Ян Баршчэўскі. Выхаванец Акадэміі прафесар Максімілян Рыла стаў даследчыкам Сірыі, Егіпета і Судана, заснаваў у Бейруце калегіюм, што пазней таксама стаў універсітэтам.

Зачыніць. Забараніць. Выслаць

Але Полацк заставаўся ўніверсітэцкім горадам усяго восем гадоў. Царскія ўлады бачылі небяспеку ў самім існаванні вышэйшых навучальняў у паняволеным краі. Полацкую прафесуру абвінавацілі ў тым, што яна выхоўвае ў студэнтаў антыўрадавыя настроі. У адным з дасланых у Пецярбург даносаў паведамлялася, напрыклад, што на матывы расейскіх народных напеваў студэнты спяваюць «самые бунтовщицкие песни, вышедшие из шайки Костюшко».

У 1820 годзе царскім указам Полацкая акадэмія была зачыненая. Усіх сябраў Таварыства Ісуса, пад кіраўніцтвам якога знаходзілася навучальная ўстанова, выслалі за межы Расейскай імперыі.



Рэканструкцыя праекта Габрыэля Грубэра — полацкая Механічная галава.
Фота аўтара

Рассеяўшыся па свеце, многія выкладчыкі і выхаванцы Акадэміі зрабілі вялікі ўнёсак у культуру іншых краін. Да прыкладу, трохтомныя «Філасофскія разважанні» прафесара філасофіі Вінцэнта Бучынскага так уразілі бельгійскага караля, што той асабіста запрасіў вучонага-палачаніна выкладаць у Лювенскім універсітэце. Сябар Таварыства Ісуса з Полацка айцец Францішак Дзеружынскі, апынуўшыся ў ЗША, стварыў там Сент-Луіскі ўніверсітэт і заснаваў цэлую сістэму каталіцкіх навучальняў, якія дзейнічаюць і сёння.

Рабаванне акадэмічных скарбаў

Нейкі час у сценах зачыненай Акадэміі працавала вышэйшая школа каталіцкага ордэна піяраў, але і яна трапіла на падазрэнне царскім уладам. Там чытаў лекцыі гісторык-патрыёт Яўхім Лялевель. У вучэльні дзейнічала філія таемнага таварыства філаматаў. У 1830 годзе піярскую вучэльню спасціг лёс Акадэміі.

Распачалося непрыхаванае рабаванне былых акадэмічных скарбаў.

Полацк развітаўся з бясцэннай акадэмічнай бібліятэкай. Каланізатары пагрузілі на фурманкі 256 пудоў самых рэдкіх і каштоўных кніг, якія павезлі ў Пецярбург і Маскву. Магчыма, туды патрапіў і назаўсёды знік Полацкі летапіс — неацэннае сведчанне нашай старажытнай дзяржаўнасці. У расейскія сталіцы адправілі музейныя калекцыі ды найлепшыя творы карціннай галерэі.

Царская камісія знішчыла патаемнае памяшканне з складанай сістэмай правадоў, адкуль полацкія механікі кіравалі сваімі вынаходкамі-аўтаматамі. Знакамітую механічную галаву, што размаўляла на розных мовах, проста выламалі са сцяны ды выкінулі на сметнік як «вредную для умов забаву». Храм святога Стэфана быў таксама абрабаваны і перахрышчаны ў праваслаўны Мікалаеўскі сабор. На шчасце, старадаўні арган удалося выратаваць і перавезці ў віленскі сабор святых Янаў. Там на гэтым музычным інструменце шмат гадоў граў славуты кампазітар Станіслаў Манюшка.

У будынках Акадэміі царскія ўлады ў 1835-м адчынілі кадэцкі корпус, што мусіў выхоўваць верных слугаў «царя и Отечества». Аднак каланізатары пралічыліся. Калі распачалося вызвольнае паўстанне 1863–1864 гадоў, большая частка кадэтаў пакінула корпус, бо падтрымлівала змагароў супроць расейскага прыгнёту. За гэта кадэцкі корпус расфармавалі і ператварылі ў вайсковую гімназію.

***

Сёння ў старадаўніх сценах былых калегіюма і Акадэміі зноў гучаць галасы студэнтаў і выкладчыкаў. Тут месцяцца некалькі факультэтаў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Сучасная навучальная ўстанова адлічвае сваю гісторыю ад моманту заснавання Полацкага калегіюма. Калі патрапіце ў Полацак, абавязкова наведайце ўніверсітэт, дзе турыстаў чакае захапляльная экскурсія. Вы пабачыце не толькі цікавую музейную экспазіцыю і адрэстаўраваныя акадэмічныя аўдыторыі і залы, але і зможаце на некалькіх мовах задаць пытанні аднаўленай механічнай галаве. Яна, дарэчы, як і ў даўнія часы, выдатна гаворыць па-беларуску.

ГІСТАРЫЧНАЯ ВІКТАРЫНА

1. Калі і кім быў адчынены Полацкі калегіюм? Каго туды прымалі?
2. Якія дысцыпліны вывучалі шкаляры ў гімназіі?
3. Як было наладжанае спаборніцтва вучняў і класаў.
4. Пра якіх закамітых выкладчыкаў Полацкага калегіюма вы даведаліся?
5. Назавіце вядомых выпускнікоў гэтай навучальні.
6. За што мы шануем прафесара Габрыэля Грубэра?
7. Чым уражвалі наведнікаў музей і карцінная галерэя калегіюма?
8. Як Полацак стаў універсітэцкім горадам?
9. Што вы даведаліся пра Полацкую акадэмію? Якія знаныя асобы яе закончылі?
10. Чаму расейскія ўлады зачынілі Акадэмію?
11. Куды патрапілі разрабаваныя каланізатарамі акадэмічныя каштоўнасці?
12. Чаму варта наведаць будынкі былой Акадэміі сёння?

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 10 (158) | 25 кастрычніка 2019 | № 40 (651) Новы Час

Ігра на некалькіх барабанах

Апавяданне

Вольга ТАКАРЧУК,
лаўрэатка Нобелеўскай прэміі па літаратуры за 2018 год



Выглядаю я так: не надта высокая, не надта нізкая, не надта пульхная, не надта шчуплая, мае валасы ні светлыя, ні цёмныя. У мяне невыразны колер вачэй. Яшчэ не старая, але ўжо не маладая. Апранаюся проста. Лёгка губляюся ў натоўпе. Калі я заседжваюся даўжэй у кавярні на рагу, людзі падсаджваюцца да мяне, але не звяртаюць на мяне ўвагі. Я іх не чапаю, не гляджу на іх. Я п'ю сваё піва ці каву і сыходжу.

Аднак мне заўсёды падавалася, што я нейкая асаблівая і непаўторная.

Мае валізы, калі я прыехала ў горад, былі пазначаныя цэтлікам з імем і прозвішчам. У маім нататніку тады было шмат крэдытных картак, нумароў, пін-кодаў. Ягоныя старонкі былі спісаныя імёнамі і прозвішчамі людзей, іх адрасамі і тэлефонамі. У мяне была таксама парфума, гадамі адна і тая ж. Я насіла вопратку ўлюбёных брэндаў і карысталася праверанай касметыкай. Калі ехала з аэрапорта, то размаўляла ў метро з кім-небудзь мужчынам, і мы абое паўтаралі падчас выпадковай размовы: люблю тое, не люблю гэтага, гэтае мне падабаецца, а тое — не. Калі ж мы разнявольваліся, то ўвогуле не зважалі на раздражняльную суб'ектыўнасць думак і казалі: гэтае вельмі добрае, а тое — не, яно глупства і з ім нельга пагадзіцца. Такая размова была прыемнай, таму што нам бракавала простага факту існавання: мы прагнулі быць яшчэ кімсьці, кімсьці вызначаным, абсалютна непаўторным.

Мая кватэра на першы погляд магла падацца змрочнай. Высокая столь, ледзь кранутая слабым святлом начных лямпаў, і несіметрычная планіроўка прывялі да таго, што спачатку я блукала па ёй начамі, каб трапіць у ванны пакой. Заплямленая падлога быццам нагадвала пра папярэдніх уладальнікаў, напэўна, мастакоў, у якіх з пэндзляў лілося багата фарбы. Крэйдавая беласць сцен непакоіла мяне, яна патрабавала нейкіх каляровых акцэнтаў. Краявід з вокнаў мог бы прыгнясці кагосьці менш чуллівага. З аднаго боку вокны выходзілі на пусты пляц, атачаны дрэвамі, тады яшчэ без лісця, пляц сабакаў, якія беглі за палкамі, што з усяе моцы кідалі іхныя гаспадары, пляц сабачых адкідаў і цікаўных сарок. Удзень на ім бавіліся падлеткі — дзяўчаты гулялі ў футбол аднолькава спраўна са светлавалосымі хлапцамі. У дзень веснавога раўнадзення смуглявыя мужчыны з пышнымі вусамі запальвалі вогнішча і вытоптвалі траву ў супольным танцы — некалькі шэрагаў танцораў, адзін за адным, як у практыкаваннях на ўроку wuefu [1].

Іншыя вокны выходзілі на касцёл з дзвюма вежамі, кожная з якіх была каранаваная мажным анёлам. Пакуль дрэва, поўнае гнёздаў галак, не схавала іх ад мяне ў траўні, шторанку я бачыла мажныя, раскошныя формы анёлаў. Яны маўкліва трубілі пабудку ўсяму гораду. Я зайздросціла тым анёлам за іх вымову, ахвяраваную абыякавым людзям. Я хадзіла голай па пакоі, каб скіраваць на сябе іх белыя вочы. Раз на тыдзень, у нядзелю, у маім касцёле адгукаліся званы, і хаця грымелі яны гучна ды істэрычна, іх рэлігійная экзальтацыя не несла чаканага плёну: сцежкай праз пляц да касцёла ішло ўсяго толькі некалькі чалавек. Касцёл спрабаваў уціснуцца ў зеляніну, быццам саромеўся сваёй наканаванай вялізнасці, збянтэжаны, ён адступаў назад, да ракі, на ўсход горада, і, пэўна, ахвотна прысеў бы на кукішкі паміж высачэзнымі гмахамі.

Вокны кухні расчыняліся на даволі вялікі панадворак, які быў адлучаны ад рэшты свету цагляным мурам будынкаў; двор зацішны, цяністы, аазіс у цэнтры горада. Сярод старых клёнаў і ліпаў тут стаялі вагоны на колах і размаіта маляваныя фургоны, падпёртыя шкілетамі ровараў, скрынкамі ад экзатычнай садавіны, кіямі для гольфа, аўтамабільнымі шынамі. Ад пачатку іх жыхары зачаравалі мяне, таму большасць часу я праводзіла на кухні. Я прысвячала ім сваё страваванне: прысунула да акна стол і цяпер, павольна спажываючы сняданкі і абеды, увесь час трымала іх на вачах, назірала за іх рэдкімі снаваннямі паміж фургонамі. Не было сярод іх ні звычайнай мітусні, ні ўвогуле паспешнасці. Яны выходзілі на вуліцу, толькі калі свяціла сонца, сядзелі на прыступках і грэлі твары. Іх дзеці забаўляліся спакойна і без крыку. Нават іх сабака здаваўся нейкім запаволеным, сабакам-філосафам, што медытаваў на абы-як пашыхтаваны хаатычны строй птушак.

Раз-пораз па апоўдні гэтыя каляровыя людзі ладзілі канцэрты. Яны выстаўлялі на вуліцу магутныя гукаўзмацняльнікі і ставілі састарэлыя блюзы альбо Паваroці (з ім, на жаль, яны спрабавалі спяваць за кампанію), а калі цямнела, мянялі оперу на манатоннае, змрочнае і жаласлівае, тужлівае «тэхна». Гукі падымаліся з падворка ўгару, быццам дым, і непакоілі анёлаў на касцельных вежах. Я знаёмілася з тымі людзьмі паволі, асвойталася з імі праз акно. Штогадзіны адрывалася ад папер, каб размяць косці. Я падыходзіла да акна і глядзела. Знаёмілася з імі, спажываючы свежую радыску, пасля суніцы і першыя мірабэлкі [2]. Я знаёмілася з імі слівамі, яблычкамі і нарэшце кукурузай, прыгатаванай у падсоленай вадзе і нашмараванай алеем. Калі рабілася цёпла, іх жыццё вiравала ўжо па-за фургонамі. Як вандроўнікі, яны гатавалі ежу на спіртавых прымусах альбо проста на агні, распаленым пад бляшанымі катламі. Яны пілі піва і, калі курылі марыхуану, выдзьмухалі дым уверх, каб ён ішоў да неба. А калі ўжо зусім вечарэла, яны выцягвалі барабаны — вялікія, малыя і зусім вялізныя, бы тыя ў філармоніі, што гучаць на канцэрце два, тры разы, а іх гук на кароткі час бярэ сэрца ў жалезную аблогу, а пасля лагодна выпускае на волю.

Яны барабанілі падчас маёй вячэры. Я ставіла крэсла насупраць акна. Клала на стол сурвэтку і прыборы, налівала кілішак віна і ела, выпрастаўшыся, з сурвэткай на каленях, быццам была ў экзатычнай рэстарацыі. Паступова, дзесьці праз дзень, я ўсвядоміла, што біццё ў барабаны зусім не спынялася ўдзень, яно толькі пераносілася ў фургоны, змяншалася да аднаго інструмента, прысыхала на сонечным святле. Уначы, зусім як той слынны экзатычны кактус, гук барабанаў расквітаў у цэлы аркестр.

Я гэта бачыла. Барабаны стаялі заўсёды ў коле — кшталту інструментаў па самаабслугоўванні, бо калі музыку надакучвала барабаніць, ён адыходзіў у цемру паміж фургонамі, а хтосьці іншы яго замяняў, хтосьці свежы і яшчэ не змучаны, хтосьці, хто мог далучыцца да вібрацыі рытму альбо, наадварот, паспрабаваць яго змяніць. Я тады была яшчэ цэлай асобай. Перад сном я ўцірала ў твар крэм. Адчыняла вокны нанач. Я сніла сны. Ранкам запісвала гэтыя сны і піла каву. Я садзілася працаваць: чытала, рабіла занатоўкі, пісала лісты, заўсёды аднолькава іх падпісвала. У мяне былі планы і спісы пакупак. Я педантычна выконвала іх. Аднак я пачынала бачыць усё інакш, калі слухала штовечар біццё ў барабаны. Біццё ў барабаны па трывозе, біццё ў барабаны на перасцярогу, біццё ў барабаны на пабудку.

Я знайшла школу на ўскрайку горада, яе параіў мне адзін знаёмы. Нават добра, што так далёка, думала я, бо праезд цягніком праз горад заўсёды мяне супакойвае, суцішвае. З цягніка не бачны горад, толькі паасобныя, аддзеленыя адзін ад аднаго будынкі, зрэшты, заўсёды спрэс у рамонце, у мітусні будоўлі: цяглавыя краны, каляровыя парканы, якія адгароджваюць іх ад вуліцы. Часам відаць некалькі вуліц, толькі што дабудаваных — з іх нядаўна прыбраныя белыя плямы раствору і бетону, але яны застаюцца незаселеныя, быццам ніхто не наважваўся заехаць у зусім новую сучасную прастору. Магчыма, у будучыні праз гэта горад зусім вылюднее: чым больш будзе новых дамоў, тым менш людзей захоча ў іх жыць, чым больш дамоў, тым менш людзей, — простае і адначасова містычнае правіла, якое павінны ведаць будаўнікі. Альбо зацугляныя людзі будуць з упартасцю, у роспачы перад новым хавацца ў ламаччы, у сквотах, у патаемна разбэрсаных па парках фургонах, а безгустоўным серабрыстым хмарачосам застанецца меланхалічна адлюстроўваць неба, хуткія танцы хмар, іх мімалётны нечалавечы рух.

Калі я ўпершыню ехала чыгункай праз горад, у мяне было дзіўнае пачуццё: гэтая язда, краявід з вокнаў, мяккае кручэнне колаў па рэйках размазвалі мяне. Таму што горад з вокнаў вагонаў падаваўся найбольш пазбытым формы, нявызначаным, гэтак жа і я сама траціла свае абрысы. Ён быў вялікім надзьмутым цэпелінам, што рухаецца па небе і ўплывае на змены кароткачасных канфігурацый хмараў, павеваў ветру. Быццам горад заставаўся ўвесь час тым самым, але пасля я штодзённа заўважала нейкія новыя падрабязнасці. На пустых пляцах за ноч выраслі зашклёныя будынкі. Здаралася таксама, што станцыі метро не захоўвалі чарговасці, выскоквалі адна за адной, альбо, наадварот, марудзілі з выхадам на сцэну. Крамы. Яны вандравалі зусім адкрыта, а час іх адкрыцця заставаўся для мяне цалкам непрадказальным. На маёй вуліцы ніколі нельга быць упэўненым, што знойдзецца тая самая крама, якая была тут учора. А калі ўжо яна была, дык гэта зусім не значыла, што я знайду ў ёй тое самае віно, той самы гатунак хлеба, што тыдзень таму. Выглядала таксама, што людзі надта нудзіліся. Увесь час былі бачныя вялікія грузавікі, поўныя мэблі — гэта жыхары пераязджалі з аднаго раёна ў іншы. Вандравалі музейныя калекцыі — у турыстаў быў з гэтым найбольшы клопат, бо яны прызвычаіліся, што музей — найбольш сталае і саліднае месца на зямлі. Можа, дзе-нідзе гэта і так, але не тут.

Трэба быць вельмі пільнай. Я павінна была глядзець. Глядзець. Назіраць за горадам, каб нішто не ўцякала з-пад майго кантролю. Калі я ехала чыгункай праз бясконцыя прадмесці, праз кварталы гаражоў, іх сумна падфарбаваныя блокі, я раз-пораз нагадвала сабе, што адчуваю сябе шчаслівай. Гэта быў хіба самы натуральны спосаб майго існавання: безуважна назіраць на адлегласці, не браць удзелу ў жыцці, толькі прыглядацца да ягоных праяваў, мінаць мімаходзь, толькі слізгаць вокам. Калі я рухалася па горадзе чыгункай, я рабілася нібы тыя турысты сталага веку, якія наймаюць турыстычны аўтобус з кандыцыянерамі і рухаюцца, як матэрызаваныя духі, расплывістыя, за таніраванымі вокнамі, з імкненнем да прыгодаў. Менавіта так было са мной: я назірала з-за шыбы, як пралятаюць краявіды, спрошчаныя да некалькіх жэстаў побытавыя сцэны — адзіны бачны адтуль кшталт зносінаў паміж людзьмі. Абагуленыя дрэвы, паркі, якія зліваліся ў адзіную лагодную зялёную бандэрольную стужку. Факт, што я не магу ні на чым прыпыніць позірк, мякка нішчыў усё маё саспелае, вечна гатовае «я». Я даверылася мігценню, якое звонку ўсё нівелюе. З акна чыгункі дэталі скасоўваліся.

Напэўна, таму, калі я выходзіла на аддаленай станцыі, адкуль мелася ісці пешкі яшчэ добры квартал, на мяне нападаў часам асаблівы голад да падрабязнасцяў. Тады я інстынктыўна плыла да газетнага шапіка (друк — сапраўдны трыюмф дэталёвасці) альбо ішла паглядзець на звычайную краму гатовых букетаў. Там расчулены падарожжам зрок арганізоўваўся наноў, падладжваўся да фіялетавага аджылкавання фрэзіі, суцішваўся на крэмавых плямках плялёсткаў ружаў.

Горад, бачны з вокнаў цягніка, не выглядаў як горад, хутчэй як хаатычна запоўненая будынкамі прастора, як мноства пунктаў, упарадкаваных вакол уваходаў у падземнае метро. Відавочна, мяне непакоіла, што я бачу нешта не тое, што ўсё. Бо ўсе паўтаралі з захапленнем: горад, горад; яны, напэўна, мелі ў галаве нейкую агульную ідэю, якая мне — зусім тут чужой — была незразумелая. Ці ж я была сляпая да чагосьці, што бачыцца ім таямнічымі сувязямі паміж хаатычна раскіданымі ўтварэннямі, нацягнутымі, быццам няроўныя пацеркі, на перабрытаныя матузкі падземнай чыгункі? Горад, горад, паўтаралі яны фанабэрліва, узбуджана, супольна ўдзельнічаючы ў незразумелай мне містэрыі. Аднак жа далучаліся да іх і тыя, хто прыехалі, — яны бывалі яшчэ больш бясстраснымі. Яны вывучалі горад на раскладзеных у парках мапах, вадзілі пальцам па ягоных артэрыях, вандравалі па дне высахлых каналаў, куплялі нават крохкія кавалкі пацярушаных, добрых яшчэ колькі гадоў таму будынкаў. Ці яны былі такія ж, як я? Разгубленыя, але з добрай прагай хоць якога разумення — накшталт тае мроі, званай чамусьці горадам.

Мне былі патрэбныя тры перасадкі, каб дабрацца да школы. Па дарозе я ела канапкі. Па дарозе прыглядалася да спадарожнікаў. Са здзіўленнем я заўважала, што ніхто з іх не цэласны, не ўтварае еднасці, — у іх было нешта адметнае, што іх характарызавала (напэўна, каб іхныя маці ніколі не маглі зблытаць іх з кімсьці чужым), і на гэтым кропка — рэшта была змазаная і невыразная. Мужчына Чорная Скура, Хлапец Пекныя Вейкі, Жанчына Шырокі Твар, Стары Вадзяністыя Вочы. Хіба людзі не ўяўляюць сабой толькі набор рысаў? Месца, праз якое праплывае распалены колерамі час?

Калі б хтосьці зверху мог сачыць за малюнкам маіх вандровак па горадзе, калі б мог скіравацца за мной і накласці на паперу гэты скампілёваны арнамент ці нават пазначыць мяне (у сне, калі я нічога не ўсведамляю), бы акальцаваную птушку, а пасля заўважыць на кампутары той дзіўны след, што я пакідаю пасля сябе, — ён убачыў бы, што след гэты безмужчынскі. Бо я знаёмілася амаль выключна з жанчынамі. Як гэта магчыма? Куды падзеліся ў горадзе мужчыны, чаму было іх менш, так мала, а калі ўжо я іх сустракала, яны здаваліся вокамгненнымі, пашматкаванымі, няскончанымі, умоў-

ными, быццам намаляванымі слабенькім мяккім алоўкам? Я падазравала, што, можа, у іх ёсць асобны раён, дзесьці на перыферыі горада альбо — так-так! — яны ўтрымліваліся ў паважных урадавых будынках з чырвонай цэглы. Адтуль яны, напэўна, кіравалі горадам. Іх нізкія галасы вібравалі, і, можа, адтуль утвараўся гэты неперарыўны шум горада. Можа, яны рыхтаваліся да наступнай вайны? Я беспадстаўна падазравала, што горад падзелены на месцы жаночыя і мужчынскія няяснымі лініямі, нябачнымі стужкамі, якія нейкая лятучая паліцыя рассоўвала ў паветры. Відавочна, гэта было няпраўдай. Бо няяркімі бывалі не толькі твары, не толькі асобныя людзі, але і полы. Я бачыла мужчынаў-балерынаў, мужчынаў-вампаў, мужчынаў-оперных дзіваў. Яны віселі на мурах і часткова засланялі будаўнічыя пляцоўкі. У іх былі памаляваныя твары, цюлевыя сукенкі на вузкіх сцёгнах, плоскія грудзі, і яны былі больш жаноцкімі за жанчын. Я прыглядалася да іх шматкроць і нарэшце пачала траціць упэўненасць: можа, гэта былі жанчыны, якія прыкідваліся мужчынамі-балерынамі? Можа, гэта былі балерыны, якія прыкідваліся жаноцкімі мужчынамі, альбо мужчынскія жанчыны? Пазней я мусіла сцвердзіць гэта ўжо раз і назаўсёды: горад быў у сваёй найглыбейшай сутнасці андрагінны, і я з лёгкасцю зацірала той вульгарны падзел на два вінаватыя божаму духу полы — адрозненне, усталяванае прайдзісветамі на ўскрайках сусвету.

Школа размяшчалася ў квартале паасобна раскіданых віл і сваёй архітэктурнай сувымернасцю нагадвала мне мой горад. Я ішла праз скверы ўзрадаваная.

Урокі праходзілі ў зале на цокальным паверсе, адкуль былі бачныя пні дрэваў у парку і людзі, якія праходзілі пад акном, але па пояс, адны ногі. Толькі дзеці мелі магчымасць кінуць на нас позірк, калі мы сядзелі за іншымі, роўнымі сталамі і зубрылі штосьці пад пільным вокам Карнэліі.

Карнэлія, мая настаўніца, казала паперамена на дзвюх мовах. Ніводнай з іх я не разумела добра, ды і яна сама грацыёзна перамешвала іх, каб у канцы дапамагчы сабе лацінай. Я ўглядалася ў яе шэрыя вочы, у рух яе вуснаў (быццам была глуханямая) і так прачытвала сэнс яе загадаў і тлумачэнняў. Спачатку я баялася, што нашыя сэнсы, яе і мой, маглі размінуцца па дарозе, бы дзве паралельныя лініі, якія, здаецца, вечна працінаюць бясконцасць, але не кранаюць адна адну, не сумуюць адна па адной.

Я ніколі не ведала, чаму гэтым разам Карнэлія будзе нас вучыць. Гэта, уласна, быў галоўны прынцып яе сістэмы: уразіць і такім чынам мацней удацца ў памяць. Спачатку яна вучыла нас песеньцы пра маленькага барабаншчыка:

Маленькі барабаншчык нам сказаў,
У цёмную прыйшоўшы ноч:
Ні золата, ні камню моц
Не прынёс я сёння вам,
Прынёс я песню вам сваю,
Тарам, тарам, тамтам.

Другі раз яна выпісвала на дошку нерэгулярныя формы дзеясловаў на замежнай мове. Адзін з першых урокаў даў мне шмат над чым паразважаць: мы атрымалі ў рукі па камяку гліны памерам з кулак, яна завязала нам вочы нашымі ўласнымі шалікамі і загадала вылепіць з гэтай гліны штосьці добрае, штосьці вельмі блізкае. Я хацела зрабіць жывёлку — так моцна бракавала мне ў горадзе звяроў: алянятка альбо хоць бы сабаку. Калі мне знялі шалік з вачэй, я ўбачыла, што вылепіла нейкі незнаёмы твар.

Гэта менавіта твары ўпарадкавалі горад. Я паволі адкрывала (і, можа, менавіта гэта было задумай Карнэліі), што горад не складваецца ні з будынкаў, ні з кварталаў, ні нават з уваходаў у метро, але з паслядоўных твараў, якія пераходзяць адны ў адны, як у тых слынных кампутарных сімуляцыях. Горад складваецца з твараў, змешаных, раскіданых па раёнах, якія часам у выніку збегу акалічнасцяў на імгненне адлюстроўваюцца адзін у адным, напрыклад, на эскалатарах — адзін твар едзе ўніз, іншы наверх, у цягніках, якія едуць у супрацьлеглыя бакі — адзін направа, другі налева, у шкляных дзвярах-круцёлках — адзін наперад, другі назад.

Паслядоўнасць твараў — рэч захапляльная, бо ўсе яны былі падобныя адзін да аднаго. Цікава, тая заканамернасць выглядала як крывая Гаўса ці бегла аднастайна роўна? Ці можна было б яе схапіць простым тэматычным выслоўем, якое б пераконвала больш за якую-кольвек літаратуру ?

Карнэлія часта звяртала нашую ўвагу на паўсюднае існаванне падабенства. Усё падобнае адно да аднаго, гэта толькі пытанне перспектывы. Падабенства насамрэч — у індустрыяльнай сетцы, якая ўтрымлівае зблытаную чупрыну свету ў адносным парадку.

Можна было б лічыць, казала Карнэлія, што наш досвед укладваецца ў агульнапрыняты закон прычынаў і наступстваў, якія надыходзяць адно за адным, абкручваюць рэальнасць гарманічным ланцужком. Але няма нічога больш памылковага (калі яна гэта казала, то ўздымала палец). Прынцып прычыны і наступства ёсць толькі фікцыяй розуму, скажам метафарычна, ёсць рухомымі сходамі, якія сапраўды падымаюць нас на нейкую гару, але пазбаўляюць хаду намагання. Крокі, хада. Рух левай — гэта прычына кроку правай нагі? Ці крок правай — гэта вынік кроку левай? — пыталася я. Відавочна не, адказвала я сабе. Таму суіснаванне крокаў стварае хаду, якая падобная сама да сябе. Падабенствы ўзаемна прыцягваюцца. Гэтаксама як супрацьлегласці. Але ж супрацьлегласці таксама адваротная падабенству. Хіба не?

Мы не ведалі, што можна ёй на гэта адказаць.

Мы ўсе былі ўпісаныя ў яе сшытак. Імя і прозвішча. Узрост. Колер вачэй. Яна ведала нашыя дасягненні і правалы. У адпаведнасці з гэтым сшыткам яна выклікала нас адказваць. Карына, je suis fatiguée, I am tired, ich bin müde, казала я. Кепска сябе адчуваю, іду дадому. Сёння я — не я. У такую хвіліну яна магла прыкласці мне да ілба электронны тэрмометр і ахвотна пацвердзіць, што ў мяне не павышаная тэмпература. Пасля яна выпрабавальна глядзела мне ў вочы (у яе былі шэрыя, мае — ніякія) і паўтарала: трэба быць кімсьці, няма выйсця. Яна заўсёды пазначаная, хоць гэта стамляе яе. Нават брак нейкай рысы — ужо рыса. Нават пазбаўленая вопраткі, ты папросту голая. Нават непрытомная, ты без прытомнасці, нават смерць не звальняе цябе ад гэтага, бо тады ты будзеш мёртвай.


Лухта, думала я, калі ехала ў метро і выпрабавальна распускала сябе ў велізарных будынках, якія праміналі за акном, выйсце ёсць — можна ігнараваць саму сябе, ігнараваць уласную паўтаральнасць, прадбачлівасць, выносіць вырашальныя моманты з сябе вонкі, за межы сябе, у свет, у парк, даручыць сябе выпадку. Гэта была б цікавая праца — трэба было б перастаць адносіць усё да сябе, ухіляцца ад простых рэакцый, ставіцца да сябе так, быццам ты прадмет сярод іншых прадметаў. Адмовіцца ад сталасці поглядаў, выказваць выпадковыя думкі, тыя, што прыходзяць да галавы, нібы сліна на язык, не мець болей ні навыкаў, ні звычак, увесь час казаць: «Не ведаю, не ведаю, не маю ўяўлення».

Адкуль бралася тое дзіўнае памкненне? Я падазравала, што вінаваты быў горад. Навуцы ж вядомыя сувязь паміж чалавекам і горадам і факт, што горад уплывае на людзей. Маўляў, Парыж робіць нас фрывольнымі і рафінаванымі. А Нью-Ёрк канкрэтызуе і вядзе па зямлі. Так кажуць. А той горад сам быў нейкі бязмежны, нерашучы, зменлівы. Ён плыў. Праплываў каля мяне, нібы вясёлы параход. Ён не меў асаблівасцяў, таму быў такі прывабны. Ён лавіў нас усіх у свае сеткі. Таму што ён быў пэўным, абяцаў спраўджанне любога найдзівоснейшага прагнення, таму што быў бясформенны, вабіў рэалізацыяй кожнай задуманай магчымасці, таму што не было ў ім ні цэнтру, ні перыферыі, ён мог зрабіць нас вольнымі і роўнымі.

Часта я была зусім змардаваная Карнэліяй, усё радзей прыходзіла на заняткі альбо спазнялася. З дзяцінства ў мяне былі праблемы з часам: ён уцякаў і турбаваў мяне. Час аднойчы зрабіўся балючым, калі ў адно кароткае імгненне я зняпацку ўсвядоміла, што значыць «цяпер». «Цяпер» значыць «ужо ніколі». «Цяпер» значыць тое, што ёсць, якраз у гэты самы момант перастае быць, абвальваецца, нібы струхнелая прыступка сходаў. Гэта паняцце страшнае, яно паралізуе, яно агаляе ўсю жахлівую праўду.

Мне было некалькі гадоў, і ела я тады ля хаты памідор. Быў поўдзень, які ўжо сплываў у цяністы змрок парка, каб урэшце рассыпацца на мільёны часцінак. Незваротна. «Цяпер» — той колішні снег, кліч крумкача, лютасць красавіка. Бэз, які расквітнеў пад маім домам у сабачым парку — зноў не далося мне заспець вяршыню яго красавання, бо калі яго маленькія ліловыя скрыначкі адкрываліся, адначасова ўжо пачыналася адцвітанне. Сонечнае зацьменне два гады таму было таксама падобнае да квітнення бэзу — цёмнае кола месяца магло быць адно «вось-вось» альбо «ўжо пасля». Момант адбыцця быў хіба што пераходам з аднаго стану ў іншы, абстрактнай, матэматычна вылічанай хлуснёй. Ён быў сацыяльнай умовай, набліжэннем да этыкету, артэфактам, створаным для спакою розуму і агульнага парадку.

Я даверылася той нявызначанасці. Чаму б нам не казаць пра сябе толькі ў мінулым часе альбо толькі ў будучым? Ці не было б тое папраўдзе, ці не было б тое з усіх бакоў больш сумленна, калі ўжо трэба штосьці казаць? Але ў яе былі свае погляды на гэтую тэму, вельмі радыкальныя, як і яна. Яна казала, што гэта найбольшы прывілей чалавека — валодаць «цяпер»: толькі гэта мы і можам мець. Таму і прыдумалі мову — каб кантраляваць перанос здарэнняў з мінулага ў будучыню, каб здзяйснялася ўлада над часам, каб затрымліваць час хаця б на тую кароткую хвіліну, калі з усёй сур'ёзнасцю ты абвяшчаеш сабе: «Я ёсць». Мець «цяпер» — значыць усведамляць сваё існаванне, значыць быць у нерухомым воку тайфуна, стаць там і прыглядацца да вірлівых падзеяў, адкрыць іх колазваротны лад, які вяртаецца шточасна і заўсёды. Яна казала таксама, што за гэтую асаблівую веду трэба дорага заплаціць, бо быць у эпіцэнтры — гэта ж перастаць бачыць самую сябе, уласна кажучы, знікнуць для сябе.



Гэта была хіба нашая апошняя размова — я знікла для яе таксама. Я прагульвала заняткі. Я выходзіла ранкам, яшчэ маючы ў галаве мэту, але ўжо праз некалькі кварталаў забывалася, куды іду. Збівалі мяне з дарогі жаночыя ногі ў фантастычна каляровых калготках, сабакі, якія беглі праз пераход у найбліжэйшы скверык, здвоеныя вазкі блізнятаў, пажарная машына, якая з цяжкасцю прабіралася праз вулічны рух, бамжы, якія бразгаталі бутэлькамі. А калі пад вечар я вярталася дамоў, ужо каля сабачага пляцу мяне сустракала знаёмае біццё ў барабаны. Мае суседзі не спалі.

Аднаго вечару, калі ўжо было зусім цёмна, я апранулася ў чорнае — каб яшчэ менш трапляцца на вочы — і выйшла на падворак. Яны сядзелі там вакол бочкі, у якой палілі нейкае смецце. Большасць з іх размаўляла напаўголасу, іншыя пілі піва, а пустыя пляшкі складвалі дзесьці ў цемры за сабой. Некаторыя з іх грукалі далонямі ў напятую скуру барабанаў. Калі стамляліся, іх месца займалі іншыя, так што рытм змяняўся ўвесь час, барабаны шукалі сябе ў прыцемках. Чым больш час насычаўся прыцемкамі, тым больш рук далучаліся да біцця ў барабаны, тым больш выразным рабіўся рытм. Былі таксама маленькія барабанчыкі, такія, што лёгка змяшчаліся на каленях ці нават у руцэ, яны асабліва часта перабівалі рытм, дамагаючыся ўвагі, як пераўзбуджаныя дзеці, як ваенныя малыя барабаны.

У тую ноч я яшчэ не наважылася зайграць. Я сядзела на ўскрайку доўгай лавы, пэўна, ледзь бачная ў цемры; у сутонні вымалёўваўся толькі мой твар, вельмі яркая пляміна, якая з'яўляецца і знікае ў залежнасці ад таго, як гарыць вогнішча. У нейкую хвіліну адпачынку, калі варту трымаў паасобны рытм, я расказвала ім пра Жыжку — у маім радаводзе даўно быў вар'ят, які абвясціў вайну ўсяму свету. У яго назбіралася нават зусім не малое войска, але ўрэшце ворагі дабраліся да яго і забілі. Але перад смерцю ён сказаў: калі памрэ, зрабіць з яго скуры барабан і яго гучаннем уздымаць тых, хто застаўся, на барацьбу. «Тум... тум... тум...», — лёгка загучалі паасобныя ўдары. Яны глядзелі на мяне ўважліва. Мая маленькая гісторыя зрабілася чымсьці матэрыяльным, мне здавалася, што перад імі ляжыць нешта кшталту падарунка. Зранку хтосьці прынёс малы барабан. Нейкая дзяўчына ў міні і сятчастых калготках павесіла мне яго на шыю і паказала, як рытмічна біць у яго. З таго часу я пачала прыходзіць туды амаль штовечар, а яны казалі на мяне — Жыжка.

Дзяўчына тая звалася Карлай. Яна з'яўлялася ўдзень, заўсёды з дзіцем ля грудзей альбо на спіне, у каляровай хустцы. Яна любіла — калі толькі магчыма — дэманстраваць стройныя доўгія ногі, а таксама любіла міні, высокія скураныя шнураваныя боты, скураныя курткі ў абцяжку. Але пасля я бачыла яе іншай: яна прычапляла да сваіх коратка астрыжаных валасоў цэлае бярэмя стракатых косак, абвівала сябе нейкай аранжавай сукенкай і рухалася вуліцай да сабачага пляцу і яшчэ далей, каб урэшце адпачыць за выстаўленым столікам якой-небудзь кавярні, дзе яна бясстрасна размаўляла з падобнымі да сябе людзьмі і не спынялася нават тады, калі карміла грудзямі дзіця.

Я таксама падсаджвалася да яе. Я замаўляла каву з малаком альбо белае віно. Мы лянотна пазіралі, як аўтамабілі асцярожна ўцякалі з перапуду ад разгаданых да непрытомнасці мінакоў.

Караліна, прыроджаная барабаншчыца, сцвярджала, што з ігрой на барабанах трэба быць вельмі абачлівай. Што з пачаткоўцамі часта адбываецца нешта кшталту сну наяве, зачараванне рытмам. Нейкая частка свядомасці дазваляе рытму сябе ўсыпіць, і тады ты не цалкам прытомная, казала яна. Яна паказала мне таксама спосаб апрытомнець, як вызначыць, сон гэта ці ява.

Працяг на стар. 16 (10) »

« Працяг. Пачатак на стар. 15 (9)

Паглядзець на свае далоні. Гэта верне цябе да сябе, будзеш ведаць, што ты ёсць, казала яна.

Такім чынам, як толькі я страчвала на золку самакантроль, калі лупіла ў кацялкі, альбо ўдзень, калі слухала біццё ў барабаны пад вокнамі, калі я ўвальвалася ў біццё альбо біццё ў барабаны працінала іншыя мае заняткі ці наганяла мяне раптоўна падчас ежы, я адкладала сталовыя прылады, выцірала вусны сурвэткай і глядзела на свае далоні.

Карла сцвярджала таксама, што ніколі нельга быць пэўным, сны гэта ці ява. Яна казала, што звычайнай агульнапрынятай цэзурай ёсць сон і абуджэнне. Гэта вельмі простая тэорыя: усё, што адбываецца з намі падчас сну, ёсць сон, а ўсё, што наведвае падчас дзённай актыўнасці, — ява. Я́віць — яна першай ужыла гэты дзіўны дзеяслоў. Мне ён не падабаўся. Ява — гэта штосьці, што не адбываецца насамрэч. Калі я кажу «яві мне сябе», гэта гучыць так, быццам я не да канца ўпэўненая, сапраўды штосьці ёсць ці мне толькі здаецца, што яно ёсць. Мусіць быць нейкае іншае слова, супрацьлеглае сну.

Той восенню адчуваліся перамены, што надыходзілі адусюль. Гэта было бачна голым вокам. Боты з вострымі насамі выціскалі боты з насамі квадратнымі, фіялетавы межаваў з хакі, а чарноцце паволі залівала крамныя вітрыны, выціскала істэрычную чырвань на ўскрайкавыя вуліцы.

Я сыходзіла да іх ужо амаль штовечар. Калі я заканчвала свае нудотныя абавязкі, гэтае сядзенне ў паперах, перакладанне іх з адной купкі ў іншую, занатоўкі, фармулёўкі сказаў і цэлых выслоўяў пра нейкія неістотныя справы, я брала з лядоўні банку піва альбо скрынку печыва ды ішла.

Бадай ніколі гэта не былі адны і тыя ж людзі. Нехта прыбываў, кагосьці не ставала. Полымя вогнішча, якое палілі ў металічнай бочцы, змяняла рысы твару. Змяняліся таксама барабаны. Найбольш я любіла, калі з'яўляўся стары, паліняллы ромельпот — так ён называўся. Гэта быў барабан высокі, годны, з дзіркай у мембране, праз якую цягнуўся шнур — барабан прамаўляў, спавядаўся цэлымі гадзінамі, галасіў і спяваў. Гэта ён быў каралём, а не той вялікі турэцкі барабан, які прыносілі два хлопцы і ў які лупілі пасля з аднаго і другога боку мяккімі палкамі. Да ромельпота была чарга, кожны хацеў забыцца ў рытмічным грукатанні, пачуццёвым і хрыплым; на золку ўжо млелі рукі, пот заліваў вочы, цела слабла ды, нібыта, ніколі не магло насыціцца. Ніколі не было гэтага досыць.

Адна поўная чарнаскурая дзяўчына прынесла індускі дамарн з двума шарыкамі, прывязанымі на папружках па абодвух баках: калі круцілі рукой з барабанчыкам, шарыкі біліся аб напружаныя мембраны і стваралі неспакойны, нервовы рытм, рытм, што, падавалася, быў прадвесцем нейкай навальніцы, якая яшчэ прыйдзе, якая ўжо стаіць за даляглядам, ужо мацнее ў сабе, быццам праз хвіліну абрынецца громам на нашыя целы, нібы град. Дзяўчына выпраўляла па коле той дамарн, і кожны хацеў далучыцца да гэтага прадвесця ачышчальнага катаклізму. Малы тыбецкі барабанчык, падобны да ляскотак, таксама перасцерагаў і раздражняў. Манатоннае націсканне было як напоўнены жалем псалом, бы скарга. Заўсёды з'яўляўся нехта не да канца цвярозы, хто хапаўся з наскоку за тамбурын, самы спакойны, самы паважны інструмент. Ніхто не перашкаджаў. Хай яму здаецца, што ён вярнуўся ў дзіцячы садок. Цяпер ён тоўк кулаком у мембрану, ажно калаціліся бляшаныя колцы, ажно невыносным рабіўся гэты металічны гук. А калі п'яны тамбурын рэзка вяртаў нас да прытомнасці, да яго далучаўся малы барабан, ягоны вайсковы сваяк, і рабілася трывожна: малы барабан казаў, што гром, які надыходзіць, па сутнасці ёсць кульмінацыяй бітвы, якую трэба весці кожны дзень наноў і не імкнуцца пазбегнуць яе. Ствараўся нясцерпны шум, і тады далучалася рэшта: афрыканскі дундун, ідыяфон-разак, што пераймаў чалавечую мову, тымпанон, на якім гралі адно жанчыны, мноства падвоеных накараў, паасобныя барабаны, зробленыя дома абы з чаго, дзіцячыя барабанчыкі, набытыя ў цацачнай краме, а таксама выкшталцоны экзатычны му-ю ў форме рыбы. І толькі цяпер ствaралася сапраўдная сімфонія здзяйснення: рытмы накладаліся адзін на адзін, рэзаніравалі, адставалі. Яны адкрывалі цыклы, стваралі асіметрыю, каб зараз жа ўпарадкаваць і шчыльна закрыць яе. Кожны з нас быў раздзёрты неспакойнай хваляй, паглынаў рытм знутры, нібыта нешта больш значнае за жаласлівы піск нашага «я». Рытм натоўпам каціўся па нас, нішчыў нас, быццам мы былі гатовыя да надыходу буры. А калі ўжо яна прыходзіла, мы капітулявалі перад ёй з недаверам, з заплюшчанымі вачыма, як пад струменямі дажджу.

Пасля ўсё сціхала. Заставаўся толькі нейкі малы гук дзіцячага барабанчыка, які парадкаваў час сіметрычна, як гадзіннік: цік-так, цік-так. Рытм пачынаў ствараць час спачатку. І так некалькі разоў за ноч. Музыка навальвалася і сціхала. Зранку заставаўся толькі нехта на варту, той, хто пільнаваў, каб не перапыняць біццё ў барабаны.

Гэта было адзінай нязменнай рэччу ў горадзе, якая для мяне існавала. Можа, акурат дзякуючы гэтаму біццю ў барабаны горад трымаўся яшчэ ў паслухмянстве, хаця відавочна сам не ведаў, каму за гэта дзякаваць.

Я пасябравала з Карэн і ўсё менш сядзела ў сваіх паперах, затое цяпер амаль штодзённа сыходзіла да сквота, да яе фургона. Мы разам глядзелі тэлевізар, я займалася яе дзіцем, калі яна выходзіла. Я завязвала сабе на жываце хустку ды ішла да іншых фургонаў, сядала на старыя канапы і моўчкі глядзела з ёй тэлевізар. У іх было шэсць тэлевізараў (адзін з іх стаяў вонкі, пад дрэвам, а ад дажджу яго ахоўваў вялікі чорны парасон, утыркнуты ў зямлю), якія заўсёды паказвалі нешта іншае. Таму калі хадзіць ад аднаго да другога, можна было трымаць на воку ўвесь свет. Войны, пластычныя аперацыі на Бермудах, дзікія звяры ў саване, чалавечы сэкс, вайсковыя парады ў Паўночнай Карэі, бясконцыя паказы мод. Часта мяне прымалі за Карэн, асабліва калі ў мяне было з сабой дзіця. Я не пратэставала. Мы абедзве сядалі апоўдні на лаўцы ў Сабачым парку і ўглядаліся ў жанчын у чадрах, захутаных з галавы да ног, альбо ў барадатых старых у суконных капялюшыках.

«Ці можаш ты не думаць?» — спытала яна мяне неяк. «Так», — сказала я. Я сядзела, абапёршыся на спінку лаўкі і ўтаропіўшыся ў мыскі ботаў, і паглыблялася ў гушчыню ўласных думак; адны думкі былі тоўстыя і сціслыя, іншыя — слабыя і празрыстыя, яны злучаліся ланцужком і наліваліся, пераходзілі адна ў адну, урэшце, закручваліся, бы брэцлі [3], бы чорныя цукеркі з глазурай, а пасля жэліраваліся разам з бурбалкамі, што плылі ўгару. Мы — зманлівая плынь, паўтарала Карына з нейкай асалодай, асабліва тады, калі ў яе атрымлівалася падкінуць камусьці дзіця і спакойна закурыць самакрутку. Няма ніякіх нязменных вызначаных цэнтраў, няма кірункаў, ёсць толькі няспынны ток, паўставанне і хуткае знікненне. Так што калі здзейсніць падарожжа ў сярэдзіну кожнага моманту, выявіцца, што базавыя, як нам здаецца, цаглінкі існавання — гэта пустое месца паміж «ужо было» і «толькі будзе». Свет складаецца з пустэчы, і, на жаль, няма словаў, каб гэта выказаць. А тое, што мы прымаем за рэальнае, у тым ліку саміх сябе, ёсць яе хвілінным прыступам, парушэннем дасканаласці неіснавання. «І што?» — дапытвалася я, бо ў мяне была звычка зацягвацца цыгарэтай і доўга выпускаць дым поўнымі колцамі. «Нічога», — казала я праз хвіліну. Адзінае, што нам застаецца, — гэта трымацца так, быццам усё рэальна існуе, так, як хоча гэта ўспрымаць нашае адначасова нерэальнае і нязвыклае да небыцця цела. Жыць так, як нібыта абавязвае праўда, якую мы праз хвіліну паставім пад сумнеў. Падпарадкоўваць сябе пачуццям і таму, пра што кажам. Разглядаць гэта як абсалютнае права. Філасофскі эталон з Сеўра пад Парыжам. Штодзённа раніцай выцягваць з-пад павекаў адчуванне мізэрнасці і марнасці і нырцаваць у раздзёрты струмень ілюзіі. Даваць сябе несці і рабіцца каляровым міражом. Але памятаць праўду.

Я паглядзела на свае далоні.

Найперш я набыла шапку з прычэпленымі да яе чорнымі коскамі. Мае радужныя абалонкі пацямнелі. Калі я ўпершыню прымерала яе перад люстрам, то ўбачыла, як на мяне вырачылася нейкая дзяўчынкападобная фігура. Я дадала шырокія штаны, што аблягалі толькі на сцёгнах, цяжкія боты — і вырушыла на ровары ў нязменны горад. І я насамрэч была той дзяўчынкападобнай істотай, бо такой мяне бачылі іншыя. Менавіта так я адлюстроўвалася ў тварах іншых людзей, і чым больш я была такой для іх, тым больш такой рабілася для сябе. Я ўжо не курыла цыгарэты, мяне не займалі паперы на стале і важныя рубрыкі. Мяне цягнула ў вытаптанае месца, поўнае гучнай музыкі, поўнае падобных да мяне самой, — у зграйкі ля дыскатэкі на паркавым беразе гарадскога возера, у інтэрнэт-кавяранькі, дзе я з радасцю знаходзіла старонкі пра моду і Брытні Спірз. Мой голас зрабіўся вышэйшым, больш піскліўым, мая скура — больш гладкай, яна лягчэй адчувала пахі ветру і вады. Я сустракала іншых такіх, як я, і бавіла з імі празрыстыя і павярхоўны час у размовах. Дамаўлялася пра наступны вечар, але ніколі не была ўпэўненая, ці з'яўлюся там.

Вось дык палёгка — зрабіцца хаця б на хвіліну кімсьці іншым! У горадзе гэта было няцяжка, бо горад багаты на крамы і гандлёвыя дамы ўсіх відаў, усіх стыляў, усіх колераў. Існуюць таксама сэканд-хэнды, дзе вопратка перадаецца ва ўжытак іншым. Гэта грым і трэсы, лакі і фарбы, прытоны тату і цёмныя, утульныя тэрапеўтычныя кабінеты. Недастаткова сябе пераапрануць, змяніць колер валасоў ці прабіць ноздры і вусны срэбным колцам. Трэба яшчэ знікнуць самому. Засынаць нікім і прачынацца нікім. Ёсць неабсяжнай даўжыні сцежкі іншых людзей, што скрыжоўваюцца самі з сабой, і што можа ўтрымаць нас ад таго, каб змяняць сябе дашчэнту? Выходзіць з дома як А, а вяртацца як Б у іншы дом.

З матэрыялу, за капейкі здабытага на турэцкім кірмашы, я зрабіла сабе доўгую сукенку, а з рэшты — сапраўдную чадру. Пацямніла бровы хной. Я ездзіла на метро ў «каляровы» квартал і заглыблялася ў натоўп. Мацала спелыя дыні. Апускала вочы, калі натыкалася на позіркі вусатых мужчынаў. Я далучалася да шматдзетных сем'яў ды ішла за імі, быццам іх паважная далёкая сваячка. Ішла ажно пад дзверы блокавых памяшканняў. Часам непрыкметна за імі ўваходзіла і сядала на канапу за моцную салодкую гарбату, якую піла з маленькіх шкляначак, а пасля дарабляла пакінутыя на століку ручныя вырабы: дзіцячыя шкарпэткі, суконныя капялюшыкі, майстэрскую абшыўку па баках хустачкі.

Я ўжо дакладна пачынала нешта мармытаць на іх цяжкай мове, ужо дапамагала прыносіць з кухні салодкія арэшкі і бралася ляпіць з кашы салодкія, мочаныя у сіропе шарыкі. Але пад вечар мне рабілася задушліва, нешта гнала мяне ад сябе, і на некалькі гадзінаў я ператваралася ў хлопца ў бейсболцы і клятчастай кашулі, які з'яўляўся там, дзе іншыя, і тоўк у турэцкі барабан палкай з лямцавым наканечнікам.

Гэта было няцяжка. Так змяніцца. Я выцягвала з сябе гэтыя іншыя постаці, як трусоў з капелюша. Я не ствaрала іх, не гулялася ў іх.

У суботы я рабілася старой бруднай жабрачкай, якая перамервае блышыны рынак у пошуках пашкоджаных філіжанак і патрэсканых люстэркаў. Мне падабалася, як тады іншыя трымаліся воддаль ад мяне. У мяне ніколі не было столькі прасторы для сябе, як тады.

Раз на месяц я затрымлівалася ў нейкім гатэлі. Выдавала сябе за замежнага бізнэсоўца. Тады я запаўняла папяльнічкі недакуркамі і глядзела па тэлевізары кацiроўкі даляра. У ваннай пакідала па сабе пах адэкалону і рэшту крэму для галення. Чаявыя для пакаёўкі — заўсёды крыху больш, чым гэта было прынята, каб яна забыла пра кагосьці, каго не было.

Гэта мяне ніколі не турбавала. Ніколі. Урэшце, я не рабіла для гэтых пераменаў ніякага намагання, я нікога з сябе не выдавала, не йграла, гэта не было тэатрам. Усю працу рабілі іншыя. Таму што ўвогуле не было і размовы пра мяне, намаганне датычыла не майго быцця, а ўспрымання мяне іншымі — і таямніца заўсёды захоўвалася. Напэўна, гэта таму (хаця я ледзьве адчувала сваё адкрыццё), што мяне цягнула да вялікіх крамаў, да велізарных універмагаў, пабудаваных вакол рухомых сходаў, каб вазіць сябе туды і назад, угару і ўніз. Іншыя, напэўна, таксама прыходзілі да гэтай ідэі: у такіх месцах можна схавацца не толькі ад іншых, але і ад самога сябе, ад кружэння вакол сябе і цяжкага складання сябе з паасобных частачак, як з кубікаў «Лега».

Такім чынам я рухалася, як усе гэтыя браты і сёстры ў хаосе, гэтыя супрацоўнікі ў яве, гэтыя аднaчасоўцы гульні, паміж асветленымі, бліскучымі секцыямі, запоўненымі гадзіннікамі, сумачкамі, панчохамі, парфумай, французскімі сырамі і моднымі пантофлямі. Рухацца — гэта ўсяго толькі мізэрны дадатак да нашага зроку. Я перамервала секцыі пахаў і праходзіла міма абыякава прыгожай прадавачкі з тонкімі пальцамі, што філігранна найгравалі мелодыі на клавіятурах касавых апаратаў. Я блукала ў лабірынтах развешаных касцюмаў, — яны выглядалі як на хвіліну пазбаўленыя жыцця фігуры, што спяць у чакальнях вялікіх крамаў, але робяцца сапраўднымі, жывымі людзьмі дзякуючы нейкаму несвядомаму целу, якое іх калісьці наведае. Я нястомна вандравала сярод сховішчаў парцаляны, шкла, серабрыста-зіхоткіх сталовых прыбораў, мяккіх купаў ручнікоў і коўдраў, ссоўвалася па сходах уніз, увесь час у плыні іншых, каб на ніжэйшых узроўнях, там, дзе бары і «Бістро», хвіліну адпачыць з кавай, а пасля зноў працавіта ўскараскацца наверх, каб зноў дазваляць сябе замазваць, растапляць, зацямняць, выцвітаць, выціраць, размываць.

Я ішла смела, вялікімі крокамі і шматкроць адлюстроўвалася ў вялізных шыбах. Нас было шмат, тысячы, можа, мільёны. Каля ўваходаў у метро сядзелі каляровыя людзі і лупілі ў барабаны.

Парыкі, прычэпленыя валасы неонавых колераў, чадра, а таксама натуральная сівізна, якая дадае павагі, выпраменьвае з твару спрактыкаваную мяккасць, — я рабілася таксама няпэўнай жанчынай, што карпее ўдзень над сталом, поўным папераў, і часам размаўляе па тэлефоне. Гэта яна, калі стаяла ўвечары перад люстрам у ваннай, калі выцірала ваткай рэшткі макіяжу, заўважала са здзіўленнем, што пад тонкай скурай ёсць нешта цвёрдае і вартае даверу — чэрап. З гэтай думкай я ішла спаць.

Тая жанчына часам прыходзіла да нас з дзіцем Клары. Яна сядала на лаўку. Расказвала нейкую дзівацкую гісторыю пра чалавека, які загадаў зрабіць са сваёй скуры барабан, але ніхто з нас ужо не памятае, як яго звалі.

Каментар

1. Wuefu (Wayland Union Education Foundation) — міжнародная адукацыйная арганізацыя.
2. Мірабэлкі — ад мірабэль, гатунак слівы.
3. Брэцлі — завітушкі, пякарскі выраб, у Баварыі традыцыйная закуска да піва.

Пераклад зроблены паводле выдання: Olga Tokarczuk. Gra na wielu bębenkach. — Walbzych, 2002.

Пераклаў з польскай Юльян Гайдук, «Прайдзісвет»

Міхал Андрасюк, «Поўня»

(Праграмная рада тыднёвіка «Ніва»)



Пісьменнік Міхал Андрасюк нарадзіўся і жыве ў Польшчы на Падляшшы, скончыў Беларускі ліцэй у Гайнаўцы. Дэбютаваў як паэт, але пасля напісаў некальki кніг прозы, галоўныя героі якіх — жыхары польска-беларускага памежжа. Асноўная мова яго твораў — беларуская.

Можна сказаць, што ў кнізе «Поўня» адсутнічае агульны сюжэт, але разам з тым кніга поўніцца мікрасюжэтамі і гісторыямі, якія звязваюць жывое і нежывое, мінулае з будучыняй. Падзеі адбываюцца ў трохкутніку Белавежская пушча — Беласток — Мінск, і тэкст таксама ўяўна складваецца з трох частак, трох ліній, якія пераплятаюцца паміж сабой.

Першы сюжэт, якім адкрываецца кніга, — любоўная лінія. Галоўны герой, ужо немалады, з Беластока прыязджае ў Мінск, дзе на вакзале знаёміцца з дзяўчынай Юліяй, і ў іх «закручваецца» раман.

Другі сюжэт — гэта родныя мясціны аўтара, якія ён апісвае з неверагоднай пяшчотай і любоўю. Родныя вёскі, іх жыхары, успаміны з дзяцінства — усё гэта аўтар выносіць са сваёй памяці, каб падзяліцца з чытачом. Аповеды бабулі, у якіх ластаўкі ўюць гнёзды «з памяці праластавак, што адляцелі ў векавечныя выраі», гісторыі пра тое, як правільна ссекчы дрэва, каб не забрацца ў яго жыццё. Герояў гэтай часткі пераважна няма ў жывых, але гэта не перашкаджае аўтару кантактаваць з імі ў сваіх мроях.

І трэці сюжэт, які не вылучаецца ў асобную частку кнігі, а праходзіць скрозь яе ўсю, — гэта своеасаблівы аўтафікшн, спроба аўтара занатаваць працэс працы над кнігай.

Козыр прозы Міхала Андрасюка ў тым, што ён дадае нашай літаратуры спецыфічнага каларыту, якога не могуць даць, напрыклад, літаратары з беларускай сталіцы.

Між іншым, сёлета «Поўня» заняла 2-е месца ў літаратурнай Прэміі Гедройца — галоўнай беларускай прэміі для празаікаў.

Сяргей Пясецкі, «Запіскі афіцэра Чырвонай Арміі»

(Выдавецтва «Медысонт»)

Гэты год у беларускім кнігавыданні можна смела назваць годам Сяргея Пясецкага (1901–1964). Сёлета па-беларуску выйшлі яго «Менская трылогія» (пра злодзеяў і блатны свет сто гадоў таму), «Каханак Вялікай Мядзведзіцы» (пра кантрабандыстаў у ваколіцах Ракава). Чарговая кніга — гісторыя прыходу Чырвонай Арміі ў верасні 1939 года ў Заходнюю Беларусь. Пясецкі апісаў гэтую падзею вачыма савецкага афіцэра Міхаіла Зубава. Ураджэнец расійскай глыбінкі, вайсковец, цалкам празамбіраваны палітрукамі. Ён верыць, што паўсюль жывуць горш, чым у Савецкім Саюзе. І паход у Заходнюю Беларусь успрымае выключна як вызваленне сялян ад «польскіх буржуяў». На справе ж высвятляецца, што ў Вільні, Лідзе, дзе ён знаходзіцца, нават рабочыя і сяляне бы тыя «буржуі» — добра апрануты, маюць дастатак на стале. Праз сваю заідэалагізаванасць



з Зубавым здараюцца розныя кур'ёзы: то два гадзіннікі начэпіць на руку дзеля саліднасці, то тэрмас для чаю прыме за бомбу...

Сяргей Пясецкі высмейвае савецкі лад, разам з тым і чалавечую прыроду падладжвацца: спачатку Зубаў славіць Сталіна, калі Гітлер нападае на Савецкі Саюз — нямецкага дыктатара, а калі высвятляецца, што Вялікабрытанія стала саюзніцай СССР — Чэрчыля. Вобраз савецкага афіцэра зборны і «ўласцівы» для любой краіны. Чалавек, які не мысліць крытычна, можа лёгка стаць ахвярай якой заўгодна прапаганды.

Дарэчы, «Запіскі...» напісаны ў 1948 годзе. Прыход жа Саветаў у Заходнюю Беларусь Пясецкі бачыў сам, таму рэаліі ў творы аўтэнтычныя.

На беларускую мову з польскай кнігу пераклаў Алесь Астравец.

Сара Лундберг, «Птушка ўва мне ляціць куды захоча»

(Выдавецтва «Коска»)



Гэта кніга, якую можна з лёгкасцю параіць для чытання як падлеткам, так і дарослым. Дзеці ўбачаць у ёй гісторыю дзяўчынкі Бэрты, якая мае хобі, але яе тата не бачыць у тым практычнай карысці. Дарослыя ж будуць «прымерваць» на сябе ролю таго таты...

Вясковая дзяўчынка Бэрта жыве ў шматдзетнай сям'і. Яна мае любімы занятак — маляванне. Толькі вось рэальнасць не пакідае ёй магчымасцей для самарэалізацыі: трэба дапамагаць па гаспадарцы, гатаваць.

«Думаю, калі б я была птушкай, то змагла б паляцець з нашай вёскі. Да іншага жыцця. Туды, дзе я была б той, кім я ёсць. Дзе ніхто не крычыць на мяне і не лічыць нязграбнай дзівачкай», — думае Бэрта.

У школе настаўнік не дазваляе маляваць так, як яна бачыць, — дзяўчынка павінна рабіць толькі так, як ёй кажуць. Тата не разумее яе занятку, лічыць, што мастак — не прафесія для дзяўчынкі. Толькі хворая мама ўспрымае занятак дачкі як нешта значнае.

Гэта кніга пра адвечную праблему дзяцей і бацькоў: адны хочуць самастойнасці ў самарэалізацыі, а другія не дазваляюць ім прыняць рашэнні.

Між іншым, у кнізе пісьменніца апісала рэальную гісторыю шведскай мастачкі Бэрты Хансан. Яна прайшла ў жыцці перыяды ад неразумення блізкіх да прызнання яе працы ў свеце.

Сара Лундберг сама зрабіла і малюнкі да кнігі. Са шведскай мовы тэкст пераклала Надзея Кандрусевіч. У Швецыі «Птушка ўва мне ляціць куды захоча» прызнана найлепшым творам для дзяцей 2017 года. А ў Мінску да 10 лістапада праходзіць выстава ілюстрацый да яе (Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў, вул. Някрасава, 3).

Наста Карнацкая, Сяргей Беражны (onliner.by)

«Той край, дзе ўтульна мне было»

У выдавецтве «Брэсцкая друкарня» накладам у 250 асобнікаў выйшла паэма Васіля Дэбіша «Шамятоўка». Эпіграфам да паэмы аўтар узяў радок несмяротнай Коласавай паэмы: «Мой родны кут, як ты мне мілы!..»

Асноўная праблематыка твора — імкненне бацькоў вывесці сваіх дзяцей у людзі ў рэаліях савецкай рэчаіснасці сямідзясятых гадоў, не даць ім растраціць спаконвечныя сялянскія і чалавечыя каштоўнасці.

Як і ў класічным творы, памяць вяртае лірычнага героя ў дзяцінства.

Плыву на хвалях успамінаў
У край, які даўно пакінуў,
І расхінаецца ў прасторы
Луг ля стаўка — зялёным морам.

Можна заўважыць, што ў «Шамятоўцы» адчуваецца стылёвае пераймание і падсвядомае запазычанне асобных сюжэтных тэм паэмы Якуба Коласа. І гэта лёгка патлумачыць. Твор класіка беларускай літаратуры, «аўтарытэтная» мадэль стылёвай традыцыі — не можа не ўздзейнічаць на паслядоўнікаў генія айчыннай літаратуры. Аднак разам з гэтым у «Шамятоўцы» свае адметныя героі, якія не глядзяць на свет вачыма персанажаў «Новай зямлі». У «Шамятоўцы» адрозная партрэтная характарыстыка, характары.

Запамінальна абмалявана хата, у якую вяртаецца лірычны герой. Тут:

Кухня з велічэзнай печкай,
Дзе патыхала мёдам, грэчкай,
Картопляй свежай, скваркай тлустай,
І пірагамі, і капустай.

З любоўю апісваецца падворак, сад і агарод, на якім «гарбуз з гарачымі бакамі ляжаў між градак з буракамі».

Гараджаніну ў першым пакаленні ўспамінаецца залатая пара дзяцінства: дзед — «не з магнатаў», цікавы апавядальнік, прызнаны знаўца пушчанскіх легендаў; бабуля — увасабленне чалавечай ласкі і дабрыні, бацька — дамарослы паэт з блакнотам і алоўкам на прыступках ганка. Дарэчы, гаспадар, «чаго ўжо там таіцца» (Якуб Колас), любіў выпіць добрую кварту горкай. Аўтар «пачарачна» прасочвае яго настрой — ад першай і да апошняй, якая прыкоўвала да стальніцы... Разам з тым, бацька — прага справядлівасці, пачуццё ўласнай годнасці.

З асаблівай любоўю, я б нават сказаў — абагаўленнем, малюецца вобраз маці. Яна — прыклад трывушчасці і гаспадарлівасці, мудры дарадца і педагог. Дзеці, якім яшчэ не прыйшла пара арацца і касіць, больш часу праводзяць з маці:

Як гусянятачкі за гускай,
Ішлі за ёй мы сцежкай вузкай.

Хвала маці, што выпеставала адразу двух паэтаў (маю на ўвазе і роднага брата Васіля — Анатоля Дэбіша).

А якое дзяцінства без прыгод і забаў!.. Самыя бяскрыўдныя з іх — салёная гарбата, суседскія слівы, скрадзеныя каўбаса і галоўкі маку. А быў жа яшчэ бацькаў пяршак у вуха прыхварэлага брата і жывы рак у ложку гаспадара.

У творы вялікая колькасць легенд, падслуханых у той час, калі госці, улагоджаныя пачастункам, «пачнуць казаць свае ўспамінкі, вясці размовы пра старынкі» (Якуб Колас).

Цікава паказаны вясковы побыт. І ў пару дэтэктыўных тэлесерыялаў сцепанешся, чытаючы пра тое, як змагаецца за жыццё прыгавораны для перадкалядкага забою вяпрук...

Адзін з асноўных герояў паэмы — прырода родная для паэта пушчанскага краю ў розныя поры года. Тут вельмі многа адметных, скрупулёзна вымаляваных дэталяў, якія не могуць не захапляць. Аўтар з любоўю апісвае крынічку, што «бяжыць гарэзліва, як быццам да рэчкі ў скварны дзень дзіцятка», качанятак, што смешна дрыгаюць ножкамі паміж аеру ў затоцы. А колькі паэтычных думак нараджаецца, калі «пасці аблокі», лежачы пасярод сланечнікавага поля (адзін з пятнаццаці раздзелаў так і называецца — «Сланечнікі»), ці, не адрываючыся, любавацца навальніцай! Усяго толькі некалькі заключных радкоў з аднайменнага раздзела:

Цішэе вецер і знікае —
Аб сосны патрапаў крыло, —
І хмара, чорная ды злая,
Сплывае, як і не было.

Браты ідуць з маці ў царкву, пасуць статак на выгане, гуляюць з сабакам Жулікам, збіраюць грыбы ці вудзяць рыбу — паўсюдна прырода і як фон, на якім адбываецца дзеянне, і як аб'ект для захаплення. Яна ў творы — своеасаблівая ода роднаму краю.

Напрыканцы хачу сказаць, што «Шамятоўка» — матэрыял для дыскусіі пра свядомае і несвядомае, актыўнае і пасіўнае пераймание класічных традыцый у айчыннай літаратуры. У другой палове мінулага стагоддзя «Новая зямля» дапамагла цікаўнаму, няўрымсліваму пушчанскаму хлопчыку, будучаму паэту, больш пільна ўглядацца ў навакольны свет і людзей вакол сябе, каб праз паўвека гэтыя ўражанні ўвасобіліся ў «Шамятоўцы» — цікавай і змястоўнай паэме пра родны край.

Мікола СЯНКЕВІЧ

«Сусветная кніжная сталіца» 2021 года

Генеральная дырэктарка сусветнай арганізацыі «UNESCO» (установы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры) Адры́ Азула́й назвала «Сусветную кніжную сталіцу» 2021 года. Ёю стала сталіца Грузіі — Тбілісі.



Праграма галоўных кніжных падзей 2021 года ў Тбілісі будзе праходзіць пад дэвізам «ОК. Такім чынам, ваша наступная кніга...? »(Ok. So your next book is...?) і сфакусуецца на выкарыстанні сучасных тэхналогій у якасці магутных інструментаў для прасоўвання чытання сярод дзяцей і моладзі. Асноўнай мэтай кніжнай сталіцы свету стане папулярызацыя чытання і павышэнне даступнасці кніг для ўсіх сацыяльных узроўняў.

Кансультатыўны камітэт па вылучэнні кандыдатуры «Сусветнай кніжнай сталіцы» складаецца з прадстаўнікоў Міжнароднай асацыяцыі выдаўцоў (IPA), Міжнароднай федэрацыі бібліятэчных асацыяцый (IFLA) і «UNESCO».

Невядомы раман Франсуазы Саган

Апублікаваны «страчаны» раман вядомай пісьменніцы і драматурга Франсуазы Саган (1935–2004), што сёлета стала найбуйнейшым літаратурным сюрпрызам у Францыі.



Няскончаная 200-старонкавая гісторыя была знойдзена сынам пісьменніцы — Дэнісам Вестхофам — у хатняй скрыні пасля смерці маці яшчэ ў 2004 годзе.

Як і дэбютны раман Франсуазы Саган, які працавітая пісьменніца напісала, калі ёй было ўсяго 17 гадоў, тэкст «Чатыры куты сэрца» ўяўляе лаканічны выклад жыцця французскага вышэйшага класа. Гэта незвычайны любоўны трохкутнік, у цэнтры якога знаходзіцца багаты бізнэсмэн Людовік Крэсон, які разбагацеў на вытворчасці гародніны. Але, як і сама Саган, ён трапляе ў жудасную аўтамабільную аварыю, пасля якой становіцца ахвярай забылытаных любоўных адносін са сваёй свякрухай.

Франсуаза Саган сама ледзь не памерла на піку сваёй папулярнасці ў 1957 годзе, калі разбілася на спартовай машыне «Aston Martin» і ўпала ў кому. Аднак нават пасля жудаснай аварыі яна паехала з Парыжа ў Монтэ-Карла на сваім іншым аўто «Jaguar», каб гуляць у азартныя гульні за сталамі казіно. Бісэксуальная геданістка, маладая Саган агаломшвала не толькі парыжскае грамадства, з якога выйшла, але і ўвесь літаратурны свет.

Вядомы фатограф Дэніс Вестхоф прызнаўся, што знайшоў рукапіс, які складаецца з дзвюх частак, пасля смерці маці. Ён апісаў гэтую знаходку як «цуд» — падчас серыі судовых баталій за матчыну маёмасць, якая была «канфіскавана, прададзена, перададзена або набыта сумнiўнымі спосабамі».

У прадмове да кнігі ён прызнаецца, што раней прыносіў тэкст рэдактару Франсуазы Саган (цяпер нябожчыку), які не захацеў публікаваць яго. Але сын пісьменніцы вырашыў сам дапрацоўваць рукапіс, дадаючы прапушчаныя словы, а часам і цэлыя абзацы. Вестхоф сказаў, што «неабходна было ўнесці выпраўленні, імкнучыся не змяняць стыль ці тон рамана».

Знакамітыя і багатыя

Дзясятка найпаспяховых пісьменнікаў

1. Пальма першынства ў неабвешчанай намінацыі «Найбагатая і вядомая» належыць **Джоан Роўлінг,** якая за літаратурную працу змагла атрымаць больш за 1 мільярд даляраў.

Самая высокааплатная аўтарка ў свеце таксама з'яўляецца і адной з самых дасведчаных у бізнэсе (ці, прынамсі, мае такіх прадзюсэраў-кансультантаў). Дзякуючы стварэнню чароўнага свету, апісанага ў раманах пра Гары Потэра, Джоан Роўлінг не толькі запаланіла ўяўленні мільёнаў чытачоў па ўсім свеце, але і стварыла велізарную камерцыйную імперыю ў літпрацэсе. У свае пяцьдзясят чатыры гады аўтарка мае прыбытак не толькі ад кніг (уключаючы п'есы і розныя «пабочныя прадукты»), але і папаўняе рахункі за кошт прасоўвання іншай тэматычнай прадукцыі, тэматычных паркаў ды, вядома ж, надзвычай папулярных экранізацый фільмаў, а гэта азначае, што толькі ў 2018 годзе капітал Роўлінг папоўніўся на пяцьдзясят чатыры мільёны даляраў. Джоан Роўлінг сёлета працавала над пастаноўкай «Фантастычных стварэнняў: злачынствы Грындэвальда», а таксама пісала (пад псеўданімам Раберта Гэлбрэйт) фантастыку для дарослых, якая не адносіцца да легендарнай «патэрыяны».

2. Былы студэнт юрыдычнага факультэта, які стаў лірыкам і хіпі, **Паўло Каэльо** мае на сваіх банкаўскіх рахунках каля паўмільярда даляраў. Ён напісаў некалькі раманаў у 1980-х гадах у сваёй роднай Бразіліі. Адзін з іх, «Алхімік», заставаўся адносна невядомым на працягу некалькіх гадоў, пакуль «Harper Collins» не перавыдала яго ў 1994 годзе. Раман хутка стаў класікай і адразу ж здабыў міжнародную славу, што прывяло да новых публікацый і прызнання крытыкаў. З таго часу Каэльо супрацоўнічаў у многіх творчых праектах на розных узроўнях і працягвае пісаць на партугальскай мове (яго апошні раман «Хіпі» быў апублікаваны ў красавіку 2018 года). Ён працуе і над тэлевізійнымі адаптацыямі некаторых сваіх твораў. Так што, магчыма, у хуткім часе свет убачыць чарговы шэдэўр аўтара, але ўжо на экране тэлевізараў.

3. Майстар жахаў **Стывен Кінг** змог зарабіць літаратурай каля 400 мільёнаў даляраў. Ён праславіўся на ўвесь свет сваімі творамі, адаптаванымі ў фільмы жахаў: «Кэры», «Ззянне», «Яно», а таксама фэнтэзійнымі гісторыямі з захапляльнымі сюжэтамі: «Цёмная вежа», «Лавец сноў» і «Беглы чалавек». Глядач мог не раз назіраць на вялікіх экранах і такія легендарныя фільмы, як «Падтрымайце мяне» і «Уцёкі з Шоўшэнка», знятыя па серыі кароткіх апавяданняў аўтара. Кінг вядомы сваёй дабрачыннасцю і палітычным актыўнасцю, а таксама тэлевізійнымі працамі ды музычным супрацоўніцтвам, цешачы армію прыхільнікаў новымі шэдэўрамі.

4. Каралева рамантычнага жанру **Нора Робертс** зарабіла 390 мільёнаў даляраў. Яна пачала сваю літаратурную кар'еру як «маці, якая сядзіць дома і нудзіцца». Пасля шматлікіх адмоваў ад выдавецтваў яна, нарэшце, змагла апублікаваць свой дэбютны твор «Ірландскія чыстакроўныя» ў 1981 годзе. З тых часоў аўтарка атрымала мноства ўзнагарод, а яе шматлікія раманы былі адаптаваныя для тэлевізійных фільмаў. Варта згадаць, што яе чарговы твор «Of Blood and Bone» пабачыў свет у снежні 2018 года.

5. На рахунку **Даніэлы Стыл** 165 апублікаваных раманаў і 375 мільёнаў даляраў. На сённяшні дзень «у арсенале пісьменніцы» пяць шлюбаў і шмат дзяцей, якія натхнялі да пабудовы «выкручастых» сюжэтаў. Былы рэкламны капірайтэр, яна выдумляла розныя гісторыі, пісала іх у вольны ад працы час. А затым, у 1972 годзе, ёй удалося апублікаваць свой першы раман. Нягледзячы на тое, што ў свае семдзесят два гады яна так і не атрымала прызнання крытыкаў за свае творы, гэта не паўплывала на яе папулярнасць сярод чытачоў. Пісьменніца працягвае публікаваць некалькі раманаў кожны год — і атрымліваць за гэта немалыя ганарары.

6. **Джэймс Патэрсан,** чалавек, які цяпер у многіх на слыху, быў дырэктар па маркетынгу, апублікаваў свой першы раман у 1976 годзе. З таго часу кніга з'яўляецца «асновай» мастацкай літаратуры ў ЗША і рэкардсмэнам-бэстсэлерам па версіі аўтарытэтнага выдання «New York Times». Па ўсім свеце прададзены дзясяткі мільёнаў кніг Джэймса Патэрсана. За што ён і змог зарабіць 310 мільёнаў даляраў. У свае семдзесят два гады пісьменнік здабыў мноства прыхільнікаў і зайздроснікаў, у тым ліку і ў асобе крытыкаў, якія скептычна ставяцца да таго факту, што большая частка яго тэкстаў напісана ў суаўтарстве. Можна згадаць і нядаўняе супрацоўніцтва з экс-прэзідэнтам ЗША Білам Клінтанам. Тым не менш, Білам увесь час з'яўляецца на тэлебачанні, а яго кнігі працягваюць прадавацца.

7. Былы адвакат па крымінальных справах **Джон Грышэм** мае ў сваіх «кішэнях» 200 мільёнаў даляраў. Большая частка яго твораў была заснаваная на рэальных падзеях, звязаных з судовымі пасяджэннямі і не толькі. Яго творы перакладзеныя на 42 мовы свету. А дэбютны англамоўны раман аўтара «Час забіваць» пасля 28 адмоваў быў выдадзены ў 1988 годзе ўсяго пяцітысячным накладам. Сёння ж юрыдычныя і палітычныя трылеры Джона Грышэма лідзіруюць у спісах самых прадаваных кніг. А прарыў у кар'еры аўтара адбыўся ў 1989 годзе, калі згаданая кніга «Час забіваць» — гісторыя, заснаваная на сведчаннях ахвяры, якія пісьменнік пачуў у судзе, а затым адаптаваная ў фільме з Мэцью Макконах'ю і Сандрай Балак — набыла шырокі розгалас. З тых часоў яшчэ сем кніг пісьменніка атрымалі «галівудскую трактоўку» (перш за ўсё «Фірма» з Томам Крузам).

8. Стваральнік легендарных «Мурашак» **Роберт Лоўрэнс** Стайн здолеў зарабіць 200 мільёнаў даляраў. Серыя дзіцячых кніг жахаў была ім створана ў 1990-х гадах і пасля была адаптаваная ў тэлесерыял. А дзясяткі іншых серыялаў жахаў, знятых па матывах гісторый сямідзесяціпяцігадовага пісьменніка, прывялі іх стваральніка да культавага статусу і значнага фінансавага даходу. Стайн працягвае пісаць у асноўным для дзяцей і падлеткаў.

9. 200 мільёнаў даляраў мае і **Джэфры Арчэр.** Ён — член Палаты лордаў, раней з'яўляўся членам парламента ў сваёй роднай Вялікабрытаніі і на працягу ўсёй кар'еры абвінавачваўся ў «брудным» гандлі і паклёпах. Судовыя працэсы і фінансавыя скандалы зрабілі Арчэра-парламентарыя банкрутам — і прымусілі яго змяніць палітыку на літаратарства, каб хоць неяк папоўніць «апусцелыя рахункі і кішэні». У выніку гэтай вымушанай змены кар'еры Арчэр напісаў шэраг раманаў, кароткіх апавяданняў і п'ес, а таксама трылогію з дзённікаў, якія распавядаюць аб часе, праведзеным у турме за ілжэсведчанне. Яго чарговы раман пад назвай «Heads You Win» пабачыў свет у лістападзе 2018 года.

10. **Дэн Браўн** таксама не застаўся «збоку» і заняў дзясяты радок у спісе найбагатых літаратараў свету, зарабіўшы 160 мільёнаў даляраў. Хто б мог падумаць, што колішні музыкант, які вырашыў прысвяціць сябе літаратуры, дасягне такіх папулярных вышыняў у такім няпростым рамястве. Яго дэбютам стала кніга «Лічбавая крэпасць». У 2000 годзе выйшаў першы з яго раманаў пра Роберта Лэнгдана «Анёлы і дэманы». У 2003 годзе — другі, упадабаны многімі, раман «Код да Вінчы». Нягледзячы на дрэнныя водгукі, шматлікія недакладнасці ў творы і абвінавачванні ў плагіяце, гэтая кніга стала самым прадаваным бэстсэлерам года. У выніку, пасля ашаламляльнай папулярнасці, была серыя высокабюджэтных галівудскіх кінаадаптацый, якія з'явіліся на вялікіх экранах па ўсім свеце.

У падрыхтоўцы старонкі выкарыстаны матэрыялы «Agence France-Presse», novostiliteratury.ru, CNN і «The Associated Press».

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 354-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by